

ШТО НОВАГА ПРАПАНУЕ ПЕНСІЁННАЯ РЭФОРМА

3

ШЧЫРЫЯ РАЗМОВЫ З АЛІМПІЙЦАМІ

8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ВЕРАСНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 186 (29555)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Я зрабіў выснову, што многія з нашых еўрапейскіх калег, адмаўляючыся ад дыялогу з урадам, з прадстаўніком урада, сёння абсалютна не разумеюць, што адбываецца ўнутры, вакол Беларусі, а некаторыя нават і не імкнуцца зразумець. Гэта сумна. У выступленнях 8—10 кіраўнікоў замежных дзяржаў прагучала тэма Беларусі. Найбольш негатыўна, што было чакана, выказаліся ў гэтым плане кіраўнікі Літвы і Польшчы, выступаючы з загадзя абсалютна лжывымі абвінавачаннямі ў адрас Беларусі. У нашым выступленні мы дадзім адказ на гэтыя беспадстаўныя выпады. У цэлым пераважная колькасць суразмоўцаў вельмі станоўча адгукаецца аб Беларусі, якая імкнецца ўносіць уклад у развіццё ААН, заўсёды прапаведуе пазітыўны парадак дня, прапаноўваючы ініцыятывы, накіраваныя на ўмацаванне стабільнасці і міру на планеце».*

# Свой камень





Хутка споўніцца дваццаць гадоў, як замак шаснаццатага стагоддзя ў былым мястэчку Любча Навагрудскага раёна зазнаў другое жыццё — пачалася яго рэстаўрацыя. Адраджэнне архітэктурна-гістарычнай каштоўнасці ўзяў на сябе ўраджэнец Любчы Іван ПЯЧЫНСКІ, які стварыў дабрачынны фонд, а сіламі валанцёраў і добраахвотнікаў пачалося ўзвядзенне веж і замкавых сцен. Ужо паўсталі дзве вежы, працягваецца будоўля трэцяй — над пакручастым берагам Нёмана, кладзецца паўночная сцяна.

Гэтымі восеньскімі днямі праца ў замку не спыняецца. Сярод будаўнікоў на муроўцы сцяны шчырые Іван ДЗЕЦЮКОЎ *(на фота)*, які прыехаў у якасці валанцёра з Аршанскага раёна. У аднаўленні помніка дойлідства дапамагаюць і вучні мясцовай школы, бо для іх такая праца, несумненна, гонар. Васьмікласнікі Павел АНТАНОВІЧ і Яўген ІГНАТОВІЧ гэтым разам упарадкоўвалі цэглу, былі падручнымі ў муляраў.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Электронны кірмаш вакансій для людзей з абмежаванымі магчымасцямі пройдзе 30 верасня.**
- Натарыусы Беларусі 2 кастрычніка далучацца да міжнароднай акцыі па бясплатным кансультаванні.



ISSN 1990 — 763X

21186>

Гонар і годнасць

# ДЛЯ НАШЧАДКАЎ ПЕРАМОЖЦАЎ

### На святкаванні 50-гадовага юбілею мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» калектыву ўручаны ордэн Францыска Скарыны



Фота Валерыя КАРАПЯ.

**У свой 50-гадовы юбілей мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» атрымаў высокую ўзнагароду. На ўрачыстым сходзе калектыву мемарыяла ордэн Францыска Скарыны ўручыў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА. Указам Прэзідэнта мемарыяльны комплекс ушанаваны за значныя дасягненні ў захаванні гістарычнай памяці, увекавечанні памяці ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі.**

СТАР. 5

Тэхналогіі

# ЛІЧБАВАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ НА ЎСІХ УЗРОЎНЯХ

### Ва ўмовах электронных стасункаў і суперсэрвісаў



Фота БелТА.

**Развіццё электроннага ўрада, укараненне ID-картак, лічбавая трансфармацыя рэальнага сектара эканомікі, ахова інфармацыі, трансгранічнае ўзаемадзеянне... А таксама дэманстрацыя дасягненняў рэгіёнаў Беларусі ў галіне лічбавізацыі і абмеркаванне яе стану, развіцця і перспектыў.**

**Такія пытанні і мэты абмяркоўваліся на Рэгіянальным лічбавым форуме #GBCregions (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне — рэгіёны), які стаў лагічным працягам Міжнароднага лічбавага форуму, што прайшоў у сталіцы вясной.**

СТАР. 7

З першых вуснаў

# «Кіраўніцтва памежных краін узяло курс на канфрантацыю з Беларуссю»

## Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў сітуацыю на граніцы з кіраўнікамі сілавога блока

**У Палац Незалежнасці запрасілі дзяржаўнага сакратара Саўбеза Аляксандра Вальфовіча, старшыню КДБ Івана Тэртэля, старшыню ДПК Анатоля Лапо і міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова. Нагодай для сустрэчы стала пагаршэнне абстаноўкі на граніцы і заявы кіраўніцтва Польшчы, Літвы і Латвіі на чарговай сесіі Генасамблеі ААН, што Беларусь патокамі бежанцаў аказвае палітычны ціск на Еўрапейскі саюз.**

### Недружалюбны курс

У пачатку размовы Аляксандр Лукашэнка папрасіў чыноўнікаў звярнуць увагу не толькі на бежанцаў — хапае праблем і ў плане абароны.

«Нам неабходна разгледзець сітуацыю, што складваецца на дзяржаўнай граніцы. Пры гэтым я папрасіў бы вас не арыентавацца толькі на тое, што адбываецца з мігрантамі. У нас вельмі сур'ёзныя іншыя праблемы, звязаныя з абаронай. Вы бачыце, што разумныя і прасунутыя палякі разгортваюць цэлыя карпусы каля нашых граніц», — пачаў размову Прэзідэнт.

Па яго словах, «лезе ў кожную шчыліну і Літва, каб паказаць сваю адданасць НАТА і ЗША», але самае сумнае — пазіцыя Украіны ў гэтым плане.

«У нас адкрываецца новы фронт, па-старому кажучы. Мы бачым, што яны (кіраўніцтва Украіны. — **«Зв.»**) робяць. Там ствараюцца вучэбна-трэніровачныя лагеры ў вялікай колькасці, дзе мэтанакіравана вучаць не толькі «беглых» працаваць па Беларусі, як кажуць спецслужбы», — канстатуе Прэзідэнт.

Ён звяртае ўвагу на патокі зброі з Украіны, на наяўнасць такіх сховішчаў каля граніц з Беларуссю.

«Калі гэтыя тайнікі для мерапрыемстваў на тэрыторыі Украіны, то навошта іх цягнуць да нашай граніцы? Яны б схавалі гэта дзесьці ў іншым месцы. Зразумела: ***мы бачым прыкметы непрыстойных дзеянняў у адносінах да Беларусі. Сітуацыя ў памежных дзяржавах для нас неспрыяльная. Больш за тое, кіраўніцтва гэтых краін узяло курс на канфрантацыю з Беларуссю»,*** — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначае, што ва Украіну цягнуць натаўскія войскі — пад выглядам вучэбных цэнтраў там фактычна ствараюць базы ЗША.

«Зразумела, нам неабходна на гэта рэагаваць. Яны не чуюць нашай заклапочанасці», — лічыць Аляксандр Лукашэнка і паведамляе, што праводзіць па гэтым пытанні кансультацыі з Прэзідэнтам Расіі. Лідары дзвюх краін дамовіліся прымаць сумесныя дзеянні.

«У адваротным выпадку мы будзем мець на граніцы Беларусі і Расіі непрымальную для нас сітуацыю. Аж да размяшчэння ракет адпаведнай далёкасці. Мы гэтага дапусціць не можам. Кіраўніцтва Украіны, на жаль, наплявала на ўласны народ і не чуе, што мы выказваем гэту заклапочанасць», — адзначае Прэзідэнт.

Паводле яго, ***абстаноўка пагаршаецца дзеяннямі пагранічнікаў памежных краін і заявамі іх кіраўнікоў, якія абвінавачваюць Беларусь у арганізацыі міграцыйнага крызісу.*** Як дадаў Аляксандр Лукашэнка, свае абвінавачванні яны выказваюць з самых высокіх трыбун, уводзячы ў зман усю сусветную супольнасць.

«Вазьміце іх выступленні на апошняй Генеральнай асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Ідзе ціск з боку Польшчы, перадусім. Зразумела, што такое Польшча ў Еўрасаюзе. Пад парасонам амерыканцаў знаходзяцца, і яны Еўрасаюзу праблем дастаўляюць не менш, чым нам. Цісprogram на Еўрапейскі саюз, заяўляючы, што мы тут выбудоўваем нейкую гібрыдную атаку супраць Еўрапейскага саюза», — абураецца Прэзідэнт.

### «Вы паклікалі туды мігрантаў — забірайце»

Пераходзіць кіраўнік краіны і да праблемы мігрантаў, адзначаючы заходнееўрапейскім суседзям: «Вы паклікалі туды мігрантаў — забірайце. ***Вы разарылі гэтыя краіны. Вы — першапрычына таго, што людзі бягуць адтуль, ад вайны, на Захад».***

Аляксандр Лукашэнка расказвае: ***існуе міжнародная арганізаваная банда, якая перавозіць мігрантаў не толькі праз Беларусь, але і праз Міжземнае мора.*** Адпаведныя людзі, па яго словах, арганізоўваюць групы бежанцаў, часткова іх фінансуюць.

«Самалётамі яны ляцяць сюды, карыстаюцца безвізавым рэжымам, што ў нас існуе. Тут іх таксама прымаюць адпаведныя людзі, вядуць на граніцу, перакідваюць. А там — у Польшчы, Літве і іншых краінах адпраўляюць далей у Германію. Яны ж не ў Польшчу ідуць, а ў Германію, Францыю, часткова ў Вялікабрытанію», — тлумачыць Прэзідэнт.

Ён нагадвае свае заявы ў бок еўрапейскіх краін: калі яны вядуць супраць нас гібрыдную і санкцыйную вайны, Беларусь не будзе абараняць іх межы.

«У адкрытую сказаў. Няхай там змагаюцца з тымі, хто не патрэбны ў Польшчы ці Літве. Для запалохвання мігрантаў, што хочуць атрымаць прыстанак у краінах Еўрасаюза, людзі ў ваеннай форме сілай гоняць іх як скаціну да нашай агульнай граніцы. Збітых, замерзлых, пакалечаных, часам мёртвых перакідваюць на наш бок. Нам што застаецца рабіць? Не кідаць жа чалавека на граніцы», — расказвае Аляксандр Лукашэнка.

Ён раіцца з вайскоўцамі: што рабіць з мігрантамі з прыходам халадоў?

«Зімой яны ж замерзнуць. Гэта ж людзі з поўдня. Карацей, гуманітарная катастрофа на граніцы. Увялі надзвычайнае становішча суседзі. Нікога туды не пускаюць, каб ніхто не ведаў, як там паміраюць людзі. Паглядзіце, усе праваахоўнікі рты закрылі і маўчаць. Супраць гэтых людзей таксама змагаюцца: не даюць сказаць слова ні журналістам, ні праваахоўнікам. Толькі з боку Беларусі яны могуць прыйсці да гэтых мігрантаў і паглядзець, як яны там на лініі граніцы існуюць», — акцэнтуе ўвагу Аляксандр Лукашэнка.

Ён заяўляе, што дапамогу людзям, якія заселі на граніцы, неабходна аказваць. Пры гэтым кіраўнік краіны звяртае ўвагу: бежанцы, якім зараз дапамагаюць нашы пагранічнікі, не хочуць у Беларусь.

«Яны настойваюць, каб прайсці ў Германію. І, як патрабавалі палякі, літоўцы, яны падалі прашэнні, каб іх прапусцілі і далі віды на жыхарства. Прайшло два месяцы. Ні слыху, ні дыху. Яны не разумеюць, што людзі замярзаюць?! Гэта іх стаўленне да людзей. Цяжка траўміраваных, пакалечаных людзей становіцца ўсё больш. Вы гэта бачыце на граніцы. Гэта выклікае заклапочанасць у Беларусі і за межамі Беларусі тых людзей, што не страцілі чалавечнасці», — адзначае Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звяртаецца да міжнародных арганізацый, кіраўнікоў грамадзянскай супольнасці замежных краін, каб яны звярнулі ўвагу на сітуацыю на граніцы, на захаванне правоў чалавека.

Па словах Прэзідэнта, вельмі важна вызначыцца, як дзейнічаць у будучыні, калі зменіцца надвор'е.

«Клімат у нас суровы. Мы атрымаем велізарную колькасць загінулых на граніцы», — адзначае Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### • Каментарый у тэму



Фота БелТА.

Па словах **старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Анатоля ЛАПО,** толькі за апошнія суткі (па стане на панядзелак) зафіксаваны спробы выціснуць на нашу тэрыторыю каля 300 нелегальных мігрантаў. Ён нагадаў, што ўжо некалькі тыдняў каля нашай граніцы знаходзіцца яшчэ адна група з 32 мігрантаў, якім дапамагаюць беларускія пагранічнікі і мясцовыя жыхары.

«Мы будзем ім дапамагаць. Мы прапаноўвалі ім прытулак у Беларусі. Але яны настроены ехаць далей у Еўрасаюз. Мы, пагранічнікі, мясцовае насельніцтва ім дапамаглі прадуктамі, цёплымі рэчамі. Мы гэтых людзей у бядзе не кінем. Але ўмовы, у якіх яны знаходзяцца, нагадваюць 1940 гады», — кажа журналістам Анатоль Лапо.

Ён прыводзіць звесткі за апошні тыдзень: каля 2000 бежанцаў імкнуліся выціснуць на тэрыторыю Беларусі з памежных краін.

Пад асаблівай увагай айчынных пагранічнікаў і ўзмацненне ўкраінскай граніцы, што мае працягласць больш за 1000 кіламетраў. За апошнія чатыры гады, заўважае галоўны пагранічнік краіны, яе забяспечылі лепш, чым польскую.

«Калі ўзяць працягласць у 1084 кіламетры граніцы (беларуска-ўкраінскай. — **«Зв.»**), там у нас ужо сігналізацыйных комплексаў каля 500 кіламетраў. Апошнія пяць гадоў мы сумесна з Расіяй рэалізоўваем праграму па абсталяванні паўднёвых рубяжоў, — дадае Анатоль Лапо. — Канечне, адразу ўсё не зробіш. Але мы імкнёмся рабіць максімальна, каб там было ўсё зачынена».

Адзначае Анатоль Лапо і ўсё большую колькасць ваеннай тэхнікі і салдат на польскай граніцы.

«Практычна каля 1000 ваеннаслужачых Польшчы знаходзяцца на граніцы. Выконваюць сваю задачу пагранічнікі, але і іншыя ўзброеныя сілы знаходзяцца на граніцы — значыць, інтарэс нейкі іншы. Фіксуем, што на пагранічных дарогах у паўднёвым напрамку рухаецца бронетэхніка, цяжкая тэхніка. У пагранічнікаў такой тэхнікі няма. Робім выснову, што там узмацняецца прысутнасць узброеных сіл», — заяўляе старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сацыял-дэмакраты перамаглі на выбарах у бундэстаг




Паводле папярэдніх вынікаў, апублікаваных Федэральнай выбарчай камісіяй, сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ) перамагла на выбарах у бундэстаг, набраўшы 25,7 працэнта галасоў. Блок ХДС/ХСС дзеючага канцлера Ангелы Меркель атрымаў 24,1 %, адзначаецца, што гэта самы нізкі ў гісторыі ўзровень яе падтрымкі. «Зялёныя» атрымалі 14,8 % галасоў, «Свабодная дэмакратычная партыя Германіі» (СвДП) — 11,5 %, а «Альтэрнатыва для Германіі» — 10,3 %. «Левыя» набралі 4,9 % галасоў, не пераадолеўшы пяціпрацэнтны бар'ер. Ангела Меркель не выстаўляла сваю кандыдатуру на гэтых выбарах і пакіне пасаду канцлера пасля 16 гадоў ва ўладзе. Кандыдат у канцлеры ФРГ ад сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі Олаф Шольц збіраецца весці перагаворы аб фарміраванні будучага ўрада без кансерватараў. Ён спадзяецца, што будуць створаныя перадумовы для «добрага супрацоўніцтва Еўрапейскага саюза з суседнімі краінамі». Пра гэта Шольц заявіў у Берліне, паведаміла ТАСС.

### Ядзерны арсенал у свеце дасягнуў больш чым 13 тысяч боегаловак

Па стане на пачатак гэтага года ядзерны арсенал дзевяці краін у сукупнасці дасягнуў 13,1 тысячы боегаловак. Пра гэта гаворыцца ў новым даследаванні Федэрацыі амерыканскіх навукоўцаў. «Нягледзячы на прагрэс у скарачэнні арсеналаў ядзернай зброі з часоў халоднай вайны, сукупны сусветны запас ядзерных боегаловак застаецца на вельмі высокім узроўні, — адзначаецца ў даследаванні. — Прыблізна 91 % усіх ядзерных боегаловак належыць Расіі і Злучаным Штатам, у кожнай з якіх маецца каля 4000 боегаловак у сваіх аператыўных ваенных арсеналах». Агульны расклад выглядае наступным чынам: Расія — 6257, ЗША — 5550, Кітай — 350, Францыя — 290, Вялікабрытанія — 225, Пакістан — 165, Індыя — 160, Ізраіль — 90, Паўночная Карэя — 45, паведамляецца ў даследаванні.

### Ковід выклікаў максімальнае скарачэнне працягласці жыцця з часоў вайны

Пандэмія каранавіруса прывяла летась да найбольшага гадавога зніжэння індэкса працягласці жыцця з перыяду Другой сусветнай вайны. Аб гэтым паведаміла Financial Times са спасылкай на даследаванне сацыёлагаў з Оксфардскага ўніверсітэта. «Для заходніх краін, такіх як Іспанія, Італія, Англія і Уэльс у Вялікабрытаніі, апошні раз падобныя значныя маштабы зніжэння чаканай працягласці жыцця ў гадавым вылічэнні назіралі падчас Другой сусветнай вайны», — паведаміў адзін з аўтараў даследавання Хасэ Мануэль Абурта. Сацыёлагі вывучылі даныя па 29 краінах, у тым ліку еўрапейскіх дзяржавах, ЗША і Чылі, і выявілі, што ў 22 з іх працягласць жыцця скарацілася больш чым на паўгода. Скарачэнне працягласці жыцця ў жанчын у васьмі краінах і мужчын у 11 краінах склала больш за год. У цэлым падзенне гэтага паказчыка зафіксавалі ў 27 дзяржавах.

Блізкая ўлада

## СЕНАТАРЫ НА СУВЯЗІ

**Прыём грамадзян правядуць у сераду, 29 верасня, Сяргей РАЧКОЎ і Дзмітрый БАСКАЎ.**

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Анатольевіч Рачкоў правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.

Асабісты прыём сенатар будзе праводзіць з 10.00 да 12.00 у Савеце Рэспублікі па папярэднім запісе. Для гэтага трэба накіраваць пісьмовы зварот на адрас: 220016, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9 або з дапамогай электроннага звароту.

Па ўсіх пытаннях можна звяртацца па тэлефоне 8 (017) 327-46-74.

У гэты ж дзень член Савета Рэспублікі Дзмітрый Юр'евіч Баскаў таксама правядзе асабісты прыём грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Прыём адбудзецца з 16.00 да 20.00 па адрасе: г. Мінск, пр. Пераможцаў, д. 4а, каб. № 205.

Папярэдні запіс па тэлефоне 8 (017) 327 26 71.

Падлічым!

# ЯК НАЗБІРАЦЬ НА ГОДНУЮ ПЕНСІЮ?

## З наступнага года ў Беларусі з'явіцца новы механізм назапашвання: дзяржава дададсць да нашых адлічэнняў

**Новая пенсіённая праграма ў Беларусі пачне працаваць з кастрычніка 2022 года. Пры гэтым з'яўленне новага механізму не адмяняе дзейных пенсій па ўзросце. Наадварот, дае магчымасць істотна іх павялічыць. Работнік можа назапашваць пэўны працэнт ад зарплаты на будучую пенсію, а дзяржава дададсць свой унёсак — такім чынам, можна атрымаць значную прыбаўку. Выплочваць яе будуць на працягу пяці ці нават 10 гадоў пасля заканчэння працоўнай дзейнасці. Пра тое, як будзе працаваць новая сістэма, у праграме «Галоўны эфір» на тэлеканале «Беларусь 1» расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**


www.belmir.by

***— Ірына Анатольеўна, у Беларусі ўжо дзейнічае сістэма добраахвотнага назапашвання на пенсію. Чым будзе адрозніваца новая сістэма?***

— Што ўвогуле сёння ёсць у Беларусі? Гэта двухкампанентная сістэма. Яна складваецца з абавязковага страхавання ў рамках салідарнай сістэмы (гарантаваная дзяржавай пенсія. — **«Зв»**.). Яшчэ ёсць абавязковае прафесійнае страхаванне для тых работнікаў, што працуюць у шкодных або асаблівых умовах. І маецца элемент накапляльнага або добраахвотнага страхавання. Яно, як дадатковы элемент да дзяржаўнага забеспячэння, дастаткова слаба развіваецца. Калі зрабіць зрэз сённяшняга ўзроўню добраахвотнага страхавання, то ўсяго толькі пяць працэнтаў працоўных пайшлі на гэта.

Чым новая сістэма, якая прапануецца, будзе адрозніваца ад дзейнага механізму добраахвотнага страхавання? Перш за ўсё гэта суфінансаванне. На першы погляд, гэта быццам бы суфінансаванне работадаўцам, але на самай справе яно будзе з боку дзяржавы. Галоўны тут, канешне ж, работнік, які прымае рашэнне аб удзеле ў сістэме страхавання. Максімальны ўзнос для работніка — 10 працэнтаў. Максімальны ўзнос для работадаўцы — тры працэнты. Працуе гэты механізм суразмерна (колькі ўносіць работнік, столькі і работадаўца. — **«Зв»**): 1+1, 2+2, 3+3. Але 4, 5, 6... 10 (для работніка) +3 (для работадаўцы).

Максімальна ў сукупнасці можа атрымацца 13 %. Аднак работадаўца ў нас сёння плаціць 28 працэнтаў (за работніка ў ФСЗН. — **«Зв»**.). Калі тры з 28 працэнтаў работадаўца заплаціць за работніка (на яго накапляльны рахунак. — **«Зв»**.), то для фонду сацыяльнай абароны гэта — выпадаючыя даходы. І тут ужо ўдзельнікам становіцца дзяржава, якая ў бюджэт фонду будзе іх пакрываць з тым, каб забяспечыць выплаты пенсій у рамках салідарнай сістэмы — бягучыя плацяжы.

***— Хто пасля прыняцця ўказа можа прымаць удзел у гэтай праграме?***

— Першае ўмова — размова ідзе пра работніка, у якога ёсць работадавец. Гэта наёмныя работнікі, у якіх ёсць працоўны дагавор. Калі мы гаворым пра ўзрост, то таксама ёсць абмежаванні: уступіць у праграму можна не пазней за тры гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту. Узроставая ўмова ставіцца, бо перыяд назапашвання важны. Чым ён даўжэйшы, тым большай фарміруецца сума, якая потым будзе размяркоўвацца як дадатковая пенсія. Пры гэтым у праекце ўказа мы прадугледзелі, што чалавек сам прымае рашэнне па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, на працягу пяці або 10 гадоў ён будзе выкарыстоўваць гэты назапашаны рэсурс.

***— Праз які час пасля падпісання ўказа пачне дзейнічаць новы механізм? Калі работадавец зможа прапанаваць работніку новую сістэму?***

— У праекце ўказа прадугледжана дата — з 1 кастрычніка 2022 года. Да гэтага часу варта правесці шэраг арганізацыйна-тэхнічных удасканаленняў — дапрацаваць шэраг праграмных рэсурсаў для таго, каб без збояў першага кастрычніка чалавек мог прыйсці ў страхавую арганізацыю і запоўніць заяву. А можна не прыходзіць — у электронным выглядзе праз сайт падаць заяву, заключыць дагавор і ўступіць у гэту сістэму.

***— Якая арганізацыя будзе займацца гэтай праграмай?***

— Гэта Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Стравіта». Чаму менавіта яно? Перш за ўсё, дзяржава гарантуе захаванасць назапашаных сум і робіць гэта праз дзяржаўную арганізацыю. Другі момант — у «Стравіты» дастаткова развітая філіяльная сетка, і калі паглядзець на дзейны механізм, то больш за 90 % з 205 тысяч чалавек, якія пайшлі на добраахвотныя назапашванні (у рамках ужо існуючай сістэмы. — **«Зв»**.), якраз і праходзіць праз «Стравіту».

***— Адлічэнні на будучую пенсію лічацца ў беларускіх рублях. Як яны будуць захоўвацца, каб пасля выхаду на пенсію гэта сума проста не знікла?***

— Сапраўды, у праекце ўказа прадугледжаны механізм капіталізацыі з улікам тых інфляцыйных момантаў, якія могуць здарацца на працягу гэтага перыяду. Мы зрабілі нават віртуальныя разлікі, колькі ж атрымае пенсіянер, калі б гэты новы механізм працаваў ужо, скажам, гадоў 20. Напрыклад, чалавек з сярэдняй заработнай платай прымае рашэнне за тры гады да пенсіі назапашваць пяць працэнтаў, за ім ідзе работадавец і адлічвае тры працэнты, сумарна атрымліваецца восем працэнтаў. І чалавек прымае рашэнне на працягу пяці гадоў з моманту выхаду на пенсію атрымліваць гэтыя назапашаныя сродкі. Выходзіць плюс 70 рублёў дадаткова да пенсіі.

Разгледзім іншы варыянт: калі работнік прымае рашэнне назапашваць з 45 гадоў. З 2022 года пенсіённы ўзрост у жанчын наступае ў 58 гадоў, у мужчын — у 63. Такім чынам, жанчына назапашвае 13 гадоў, мужчына — 18 гадоў. Тая ж формула — сярэдняя зарплата і восем працэнтаў (пяць плюс тры). Мужчына дадаткова, на працягу пяці гадоў да сваёй асноўнай пенсіі, якую яму гарантуе дзяржава, будзе атрымліваць штомесяц каля 325 рублёў, жанчына — 284. Пры ўплаце ўзносаў з сярэдняй заработнай платы і максімальным працоўным стажы (а туды ўключаецца і вучоба, і догляд дзяцей для жанчын — гэта 40 гадоў; для мужчыны, куды ўключаецца і служба ў войску, — 45 гадоў) гарантаваная дзяржавай пенсія будзе ў сярэднім 570 рублёў. А вось у пенсіянера, у якога сярэдняя заработная плата і такі стаж, з улікам назапашванняў за 18 гадоў гэта ўжо 900 рублёў пенсіі. Такія лічбы на цяперашні момант. Гэта сур'ёзны бонус, які мусіць падштурхнуць работнікаў, грамадзян нашай краіны задумацца пра ўзровень жыцця ў новым перыядзе — пасля выхаду на пенсію.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# Неба ачысціцца ад хмар, значыць, уначы — замаразкі

## Разам з гэтым удзень нас будзе падаграваць да 16—18 цяпла

**На гэтым тыдні чакаецца спакойнае, без істотных ападкаў, надвор'е. Толькі ў чацвер і пятніцу на крайнія заходнія раёны краіны перамесціцца малаактыўны франтальны раздзел, які абумовіць там кароткачасовыя дажджы. Перыядычна на нашай тэрыторыі будзе сонечна і ўжо пасеннему цёпла. Разам з тым у другой палове тыдня з ростам атмасфернага ціску па ўсходзе краіны аблокаў стане менш, і тут на глебе і ў паветры чакаюцца невялікія замаразкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ціха і без дажджоў чакаецца ў аўторак. Максімальная тэмпература паветра — 10—16 градусаў вышэй за нуль. І ў сераду таксама будзе пераважна без ападкаў. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень па паўднёвым захадзе парывісты. Тэмпература паветра ўначы на ўзроўні 1—7 цяпла, у асобных раёнах на глебе магчымыя слабыя замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень паветра прагрэецца ад плюс 8 градусаў да 15 цяпла.

У апошні дзень верасня прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень на крайнім захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер будзе паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень па захадзе парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 цяпла, на большай частцы тэрыторыі краіны на глебе і месцамі ў паветры будуць замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. А вось удзень сонца прагрэе паветра да плюс 9—15 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах месцамі да 17 цяпла.

У пятніцу, на старце другога месяца восені, будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах па захадзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе плюс 1—8 градусаў, месцамі па краіне, а па Магілёўскай і Гомельскай абласцях на большай частцы тэрыторыі чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. Удзень будзе аднosна цёпла, калі тэмпература паветра пачне падымацца да 10—16 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя ўдзень стане крыху цяплей, а ноччу магчымыя замаразкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Дзеля вырашэння супольных задач

## У Маскве прайшла сустрэча кіраўніцтва ФНКА «Беларусы Расіі» з прадстаўнікамі Выдавецкага дома «Звязда»

Дзясяткі тысяч беларусаў жывуць і працуюць у сталіцы Расіі. І, канешне ж, ім цікавыя медыйныя, інфармацыйныя стасункі з радзімай. Пра гэта і ішла размова на сустрэчы ў офісе ФНКА «Беларусы Расіі» ў Маскве. Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч і намеснік дырэктара — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксей Чарота расказалі пра грамадска-палітычны часопіс «Беларусь», які «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выдае на трох мовах — беларускай, англійскай, кітайскай; газету «Голас Радзімы», іншыя беларускія перыядычныя выданні. Старшыня ФНКА «Беларусы Расіі» Сяргей Кандыбовіч перадаў праз выдаўцоў падзяку Міністэрству інфармацыі Беларусі за сістэмнае забеспячэнне суродзічаў бібліятэчкамі кніг, выдадзеных у Беларусі.

На сустрэчы былі разгледжаны і пытанні сумеснага выдання кніг-білінгваў для беларускай дыяспары. Ішла размова і пра зборнік перакладаў беларускіх народных казак на мовы народаў свету. «Такое выданне паспрыяе, — зазначыў удзельнік сустрэчы, урадженец Давыд-Гарадка, намеснік старшыні ФНКА «Беларусы Расіі», Герой Расійскай Федэрацыі Аляксандр Дарковіч, — наладжванню міжнацыянальных стасункаў, пашырыць сяброўства розных дыяспар, а таксама павялічыць уяўленні пра Беларусь, беларускую культуру ў свеце».

**Сяргей ШЫЧКО.**

Працаўладкаванне

# СТАЦЬ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНЫМ

**Каля 300 чалавек з ліку беспрацоўных атрымалі магчымасць набыць вопыт практычнай работы.**

— Адной з паслуг па садзейнічанні ў працаўладкаванні, прапанаванай службай занятасці, з'яўляецца набыццё вопыту практычнай работы, — адзначылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. — Паслуга прадугледжана з мэтай набыцця беспрацоўнымі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў практычнай дзейнасці ў адпаведнасці з атрыманай прафесіяй для павышэння канкурэнтаздольнасці на рынку працы і пашырэння магчымасцяў працаўладкавання.

У студзені — жніўні 2021 года 288 чалавек з ліку беспрацоўных атрымалі магчымасць набыць практычны вопыт, з іх у Гомельскай вобласці — 92, у Гродзенскай вобласці — 60, у Брэсцкай вобласці — 34, у Магілёўскай вобласці — 34, у Мінскай вобласці — 27, у Мінску — 23 і 18 чалавек у Віцебскай вобласці.

Для набыцця вопыту практычнай работы па атрыманай спецыяльнасці накіроўваюцца беспрацоўныя, зарэгістраваныя ў службе занятасці. Сярод іх — выпускнікі ўстаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю, асобы, якія прайшлі прафесійную падрыхтоўку ці перападрыхтоўку па накіраванні службы занятасці, грамадзяне, якія доўгі час (больш за 12 месяцаў) не працавалі ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама дзіцяці ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванага вірусам імунадэфіцыту чалавека ці хворага на СНІД.

З беспрацоўным заключаецца тэрміновы працоўны дагавор на тэрмін ад 2 да 6 месяцаў. Наймальнікам, якія даюць беспрацоўным месцы для набыцця вопыту, службай занятасці часткова кампенсуюцца затраты на аплату іх працы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ПАКЛОН ХЛЕБАРОБАМ

## Міншчына — лідар па намалотах

**У Капылі прайшоў Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі», які сабраў сотні чалавек з усёй краіны.**

Мінская вобласць традыцыйна ўнесла важкі ўклад у агульнарэспубліканскі каравай.

— З улікам кукурузы ў гэтым годзе дасягнём больш чым два мільёны тон. Нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я — халодная вясна, анамальна спякотнае лета, дажджлівая восень — нашы працаўнікі атрымалі больш чым варты вынік. Ён дазволіць забяспечыць харчовую бяспеку не толькі Мінскай вобласці, але і краіны ў цэлым. У аграрным сектары Міншчыны працуе крыху больш за 54 тысячы чалавек. Гэта менш за чатыры працэнты насельніцтва вобласці. Але мы параўнальна невялікім калектывам фарміруем чвэрць аб'ёму сельскагаспадарчай прадукцыі краіны. Прадукцыю, вырабленую ў Мінскай вобласці, ведае не толькі кожная беларуская сям'я, але і замежныя спажыўцы, — расказаў першы **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ.**



Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН узнагароджвае Нясвіжскі раён, які стаў пераможцам штогадовага спаборніцтва па ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур у Мінскай вобласці.

Сярэдняя ўраджайнасць зерневых па вобласці склала 35 цэнтнераў з гектара. А ў некаторых раёнах гэты паказчык значна вышэйшы: у Мінскім — 46,4 цэнтнера на круг, у Клецкім — 48, у Дзяржынскім — 50,2. У лідарах Нясвіжскі раён, дзе сабралі 63,2 цэнтнера з гектара.

Цэнтральны рэгіён стаў пераможцам сярод абласцей Беларусі. Узнагарода — Падзяка Прэзідэнта і сертыфікат на суму 580 тысяч рублёў. А **старшыні Мінаблвыканкама Аляксандру ТУРЧЫНУ** ўручаны нагрудны знак Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання «За заслугі ў сельскай гаспадарцы».

Па словах Аляксандра Турчына, гэты год быў не самы лёгкі для сельскай гаспадаркі. І кожны працаўнік, які ўклаў часцінку душы ў агульны каравай, варты павагі і ўзнагарод. За значны ўнёсак у сельскагаспадарчую вытворчасць Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена адкрытаму акцыянернаму таварыству «Гарадзілава» Маладзечанскага раёна. Акрамя гэтага, гаспадарка атрымала ключы ад новага трактара. Падзяка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена таксама дырэктару рэспубліканскага дачэрняга ўнітарнага прадпрыемства «Шыпяны-АСК» Вадзіму Касцяневічу, дырэктару ААТ «Міраполле» Алегу Кучынскаму. Граматамі Мінаблвыканкама, Савета Міністраў, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ўзнагароджаны не толькі камбайнеры, механізатары, але і спецыялісты гаспадарак, работнікі медыцыны, гандлю, грамадскага харчавання, якія забяспечвалі надзейны тыл хлебаробам. Не забылі і фермераў. Дыплом і 17 тысяч рублёў атрымала фермерская гаспадарка Сяргея Корзуна з Мінскага раёна. Сноўскаму сельвыканкаму і Капыльскаму доследнаму лясгасу ўручылі сертыфікаты на трактар. А пераможцам рэспубліканскага агляду-конкурсу стаў Смалявіцкі раён, які ўзнагароджаны дыпломам і грашовай прэміяй у памеры 29 тысяч рублёў.

Пасля афіцыйнай часткі на цэнтральнай плошчы горада ўсе ахвотныя змаглі прадэгуставаць каравай Мінскай вобласці.

Ну, і, вядома ж, якое свята без падарункаў жыхарам горада і раёна! А яны былі даволі важкія. Юныя грамадзяне Капыля, у прыватнасці, атрымалі новую дзіцячую бібліятэку з кіназалай. Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прыняў удзел **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ.**

— Сёння практычна ўвесь свет паглыблены ў інтэрнэт. Але разам з тым кніга — гэта часцінка нашай духоўнасці, ведаў. І мы павінны ўсё з яе браць. Менавіта чытаючы кнігу, мы становімся іншымі і ў культуры, і ў жыцці, і ў стасунках. Наогул, у Мінскай вобласці ўдзяляецца асаблівая ўвага сацыяльнай сферы. Адкрываюцца новыя школы, бібліятэкі, дамы культуры, — адзначыў Іван Маркевіч.

Падчас фестывалю працавалі сцэнічныя пляцоўкі, горад майстроў, выстаўкі-конкурсы караваяў і снапоў рэгіёнаў Міншчыны, выстаўкі рэтрамашын, інтэрактыўныя пляцоўкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Дэпартамента аховы Мінскай вобласці, упраўлення ўнутраных спраў. Яны карысталіся асаблівай папулярнасцю сярод дзяцей, якіх тут чакалі гульні, паласа перашкод, тэсты на веданне правіл бяспекі, навучанне асновам жыццядзейнасці з выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій і сучаснага абсталявання.



Шмат наведвальнікаў прывабіла інтэрактыўная пляцоўка «Беларуская хата на смачныя стравы багата», дзе працавала «Сядзіба рыбака», «Дранік-шоу», «Мядовая заімка». Усе ахвотныя маглі паўдзельнічаць у майстар-класах па прыгатаванні нацыянальных беларускіх страў.

Разынкай свята стаў культурна-пазнавальны квэст, падчас якога госці фестывалю паўдзельнічалі ў розыгрышы прызоў: тэлевізара, халадзільніка, планшэтаў.

Праграма свята прадугледжвала і канцэрт з удзелам выканаўцаў беларускай і расійскай эстрады. Гасцей фестывалю і жыхароў Капыля парадаваў гурт «Фабрыка», Аляксандр Саладуха, Алена Ланская, Вікторыя Алешка і іншыя.

Завяршылі мерапрыемства светавое шоу і феерверк.

А эстафета правядзення абласнога фестывалю-кірмашу ў наступным годзе перададзена Стоўбцам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота БелТА.**

# АГРАРНЫ БОЎЛІНГ І ЯБЛЫЧНЫ ДАРТС

## Чым уражвала свята ўраджаю ў Скідзелі

**У суботу горад-спадарожнік Гродна прымаў рэгіянальнае свята ўраджаю. Гэту падзею тут чакалі яшчэ летась, але фестываль-кірмаш з-за пандэміі было вырашана перанесці на гэты год. Горад на рацэ Скідзелька падрыхтаваўся як след — аднаўлены будынкі, дарогі, паркі. Не падвяло і надвор'е. Пасля зацяжных дажджоў дзень выдаўся хоць і ветраны, але амаль без ападкаў. Вядома, галоўны настрой задавала не надвор'е, а атмасфера.**

Фота grodnonews.




Адной з асаблівасцяў стала прэзентацыя ручніка, які складаецца з 17 элементаў — па колькасці раёнаў вобласці. Кожны выкананы ў рознай тэхніцы і адлюстроўвае галоўныя асаблівасці таго ці іншага раёна. Ручнік будзе перададзены ў музей Гродзенскага раёна.

А пачалося свята вельмі прыгожым кампазіцыйным шэсцем «Шлях да хлеба». Імправізаваныя каласкі, касцы, залатая ніва... За касцюміраваным прадстаўленнем ішлі рэальныя ўдзельнікі падзей — тыя, хто здабываў важкі каравай Гродзенскага рэгіёна. Менавіта яны заслужылі самыя шчырыя словы падзякі. У адрас абласнога фестывалю «Дажынкі» паступілі прывітальныя лісты ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі Качанавай.

Усе, хто дасягнуў высокіх вынікаў, атрымалі ўзнагароды. Пераможцамі ў абласным конкурсе прызнаны Гродзенскі, Берастаўіцкі і Карэліцкі раёны. Найлепшымі на ўборцы зерневых сталі тры гаспадаркі Гродзенскага раёна — СВК імя Сянько, СВК «Свіслач» і ВК імя Крамко. Падчас урачыстай цырымоніі былі адзначаны заслугі кіраўнікоў, інжынераў, камбайнераў, аграномаў, вадзіцеляў, аператараў зернасушыльных установак і многіх іншых.

Аграрны сектар — адзін з галоўных на Гродзеншчыне. Тут працуе большая частка насельніцтва, якое занятае ў эканоміцы рэгіёна. Сёлета хлебаробы Прынёманскага краю ўнеслі ў рэспубліканскі каравай больш за 1 мільён 100 тысяч тон зерня. З году ў год вобласць займае вядучыя пазіцыі ў краіне па большасці сельскагаспадарчых паказчыкаў. Па словах намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Субоціна, Гродзенскі рэгіён заўсёды быў наперадзе па асваенні новых тэхналогій у гаспадаранні, агранаміі, жывёлагадоўлі. Вось і сёлета сабраны добры ўраджай.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік паведаміў, што вобласць па-ранейшаму дэманструе самыя высокія вынікі ў краіне па ўраджайнасці — 35,6 цэнтнера з гектара. Гродзенскі раён атрымаў з гектара ў сярэднім 64 цэнтнеры. І хоць паказчыкі крыху горшыя, чым летась, — гэта той максімум, якога ў складаных умовах надвор'я ўдалося дасягнуць.

Свята ўраджаю раскінулася па ўсім горадзе. Асабліва ўразілі караваі — яны былі паўсюль: на імправізаваных падворках, на шэсці, атрымалася нават каравайная алея. Кожны раён прадставіў на конкурс свае снапы і хлябы. Алея з надзвычай прыгожых і разнастайных экспанатаў стала вельмі прывабнай фотазонай. У гэтай якасці карысталіся папулярнасцю і жывыя статуі.

Удзельнікі конкурсу рыбаловаў, а такіх набралася з паўсотні, спрабавалі сваё рыбацкае шчасце каля фантана. І нездарма. Аднаму з канкурсантаў нават удалося вылавіць рыбу вагой 1 кілаграм 350 грам. Ён і стаў пераможцам конкурсу. Улоў, дарэчы, можна было забраць сабе. Арганізатары прызналіся, што на ўсіх ахвотных не хапіла вуд.

Ветліва сустракала гасцей тэматычная пляцоўка «Хатка бабкі Агапкі», дзе можна было пакаштаваць стравы знакамітай адэльскай кухні, якія ўнесены ў спіс нематэрыяльнай спадчыны. Госці маглі паўдзельнічаць ва ўнікальным абрадзе «Выпяканне хлеба» і ў майстар-класе побытавых танцаў. Асіхкаў запрасілі на цукровыя гульні, якія арганізаваў Скідзельскі цукровы камбінат. Каб пераможчы, трэба хутчэй за іншых пранесці шэсць мяхоў цукру. Нямала ахвотнікаў сабраў і конкурс лесарубаў, праўда, сярод прафесійных работнікаў гэтай галіны. Затое ўсе прысутныя маглі ўбачыць сучасную лясную тэхніку.

Тыя, хто прагаладаўся, сілкаваліся салдацкай кашай. Гасцінна сустракалі ўсіх прысутных на падворках раёнаў. Тут здзіўлялі народнай кухняй, танцамі, песнямі, прыгожымі ўборамі. Кожны падворак вабіў чымсьці асаблівым. Напрыклад, на карэліцкай пляцоўцы вучылі плесці льняныя вяроўкі старажытным спосабам. На падворку Воранаўскага раёна частавалі мёдам, а на зэльвенскім — стварылі атмасферу знакамітага «Ганненскага кірмашу» і нават запраглі каня. Кожны падворак перадаў па-свойму сельскі каларыт. І ўсюды галоўным атрыбутам быў свежаспечаны дажынначны каравай.

Дзейнічала больш за 30 святочных лакацый, як традыцыйных, так і прадстаўленых упершыню. Многія паспрабавалі свае здольнасці ў боўлінгу, у лабірынце стагоў сена. У сельскай эстафеце спаборнічала моладзь БРСМ. Яны гулялі ў аграрны баскетбол, яблычны дартс, перакочвалі на хуткасць цюкі. Нават цягнулі «рэпку». Усе пераможцы атрымалі дыпломы і прызы.

Эстафету «Дажынак» Скідзель перадаў Берастаўіцкаму раёну.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ДЛЯ НАШЧАДКАЎ ПЕРАМОЖЦАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Брэсце прайшлі маштабныя святкаванні, прысвечаныя паўвекавому юбілею мемарыяла і 65-годдзю Музея абароны крэпасці. У цытадэлі ў гэты дзень прайшло некалькі мерапрыемстваў. Яе наведаў прэм'ер-міністр краіны Раман Галоўчанка. Ён ушанаваў подзвіг абаронцаў хвілінай маўчання, усклаў кветкі да Вечнага агню. А яшчэ прэм'ер наведаў маладзёжны патрыятычны цэнтр, які створаны на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання ў памяшканні штаба 125-га стралковага палка. У двухпавярховым будынку размешчаны вучэбныя і метадычныя кабінеты, спальныя памяшканні. Структура цэнтра ўключае ў сябе дзейнасць аб'яднанняў па інтарэсах. Рэалізоўваюцца тры асноўныя кірункі: ваенна-патрыятычны, спартыўна-тэхнічны і турысцка-краязнаўчы.

Цяпер вядзецца работа па пераўтварэнні цэнтра з абласнога ў рэспубліканскі аб'ект з тым, каб сюды маглі ехаць дзеці з усіх рэгіёнаў краіны.

Прэм'ер-міністр краіны адзначыў важнасць работы, падкрэсліў таксама, што мемарыял будзе мець вялікае значэнне для многіх пакаленняў беларусаў: «Цяжка адшукаць у нашай краіне роўны па значнасці помнік, дзе сканцэнтравана столькі мужнасці і гераізму, любові да Радзімы. У кожным узросце адкрываеш у крэпасці нешта новае для сябе. З гадамі лепш разумееш, што зрабілі яе абаронцы дзеля агульнай Перамогі. Упэўнены, што мемарыял будзе жыць у вяках».

Калектыў комплексу ў пачатку года стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва за значны ўклад у захаванне гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, рэалізацыю праекта Саюзнай дзяржавы па рэстаўрацыі і музеефікацыі збудаванняў Брэсцкай крэпасці. А цяпер вось мемарыяльны комплекс удастоены ордэна Францыска Скарыны.

Высокую ўзнагароду калектыву ўручыў Раман Галоўчанка на ўрачыстым сходзе ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы.



Прэм'ер-міністр цёпла павіншаваў супрацоўнікаў установы, адзначыў іх каласальную працу ў справе ўвекавечання подзвігу абаронцаў:

— Калі знешнія сілы спрабуюць перапісаць гісторыю і перагледзець урокі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ўнесці разлад у наша грамадства, асабліва ўзрастае роля музейных работнікаў, — сказаў кіраўнік урада. — Гэтыя людзі даносяць праўду да грамадства, тым самым выхоўваюць патрыятызм, любоў да Радзімы. Гэта трэба рабіць дзеля нашай агульнай будучыні, дзеля тых, хто загінуў за ідэалы свабоды і незалежнасці, дзеля таго, каб падобнае больш не паўтаралася.

Прэм'ер-міністр пажадаў супрацоўнікам плёну ў рабоце. Паводле яго слоў, трэба скарыстаць той факт, што зараз адкрываюцца новыя крыніцы інфармацыі, становяцца даступнымі ў віртуальнай прасторы архіўныя звесткі, таму даследчыцкую работу неабходна працягваць. Раман Галоўчанка зачытаў прывітальны адрас ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі калектыву крэпасці.

Прывітальны адрас калектыву «Брэсцкай крэпасці-героя» ад імя Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна зачытаў **генеральны консул Расіі ў Брэсце Ігар КАНЯКІН.**

Заслужаныя ўзнагароды супрацоўнікам крэпасці ўручыў таксама **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ.** Ён падзякаваў супрацоўнікам за прафесіяналізм, адданасць справе, адзначыў, што за паўстагоддзя крэпасць наведалі 25 мільёнаў чалавек са 140 краін свету: «Дзякуючы розным пакаленням экскурсаводаў, супрацоўнікам людзі ва ўсім свеце ведаюць пра гераізм удзельнікаў крэпасці, ведаюць праўду аб вайне».

У гэты ж дзень адзначалі не толькі 50-годдзе мемарыяльнага комплексу, але і 65-годдзе Музея абароны. Гэтым падзеям быў прысвечаны круглы стол, на які сабраліся навукоўцы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, шматлікія госці. На мерапрыемстве пабываў і Канстанцін Смірноў, сын Сяргея Смірнова, пісьменніка, які адкрыў для свету подзвіг абаронцаў крэпасці. Канстанцін Сяргеевіч сказаў, што Брэсцкая крэпасць прысутнічае ў яго жыцці фактычна з моманту нараджэння. Абаронцы крэпасці бывалі ў іх дома, начавалі, прыходзілі да бацькі з радасцямі і бедамі, былі фактычна сваякамі. Канстанцін Смірноў дадаў, што перыядычна наведвае Брэст, ходзіць не толькі ў крэпасць, але і на вуліцу, якая носіць імя бацькі. Паводле яго слоў, наведванне крэпасці для яго заўсёды становіцца асабліва хвалюючым момантам: «І ў нашай, і ў вашай краіне сёння шмат гавораць пра патрыятызм. Можна нічога не гаварыць — проста ісці сюды і глядзець, і ўсё стане ясна».

Музей абароны быў адкрыты ў тым ліку дзякуючы і Сяргею Смірнову ў 1956 годзе. Менавіта з яго экспазіцыі пачынае знаёмства з мемарыялам большасць наведвальнікаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

Культпаход

# ПАМЯЦІ МАЙСТРА

**У Магілёўскім музеі этнаграфіі адкрылася выстаўка, прысвечаная класіку савецкага фотамастацтва Паўлу Цішкоўскаму**

**Яна падрыхтаваная ўдзельнікамі магілёўскага народнага фотаклуба «Вясёлка». У экспазіцыі 44 работы 18 аўтараў. Усе іх яднаюць дрэвы, яны тут самых розных відаў і форм. Гэта цэлы Сусвет, які зусім па-іншаму ўспрымаецца праз фотааб'ектыў.**

— Калі мы ўбачылі фота нашага калегі Аляксандра Рожына з дрэвамі, якія абдымаюцца, мы адразу ж успомнілі работу Паўла Цішкоўскага «Абдымкі», — расказвае член фотаклуба, вядомы магілёўскі фотамайстар Ірына Савосіна. — Цішкоўскі, лічы, класік у фотамастацтве з вельмі тонкім густам і ўспрыманнем навакольнага свету. Мы вырашылі пашукаць у сваіх архівах здымкі дрэў і прысвяціць гэтаму аўтару выстаўку.

Павел Цішкоўскі родам з вёскі Калесішча Магілёўскага раёна. У дзяцінстве быў зачараваны карцінамі Шышкіна, Левітана, Саўрасава, Куінджы. У 60-я гады мінулага стагоддзя захапіўся фатаграфіяй, стаяў ля вытокаў стварэння клуба «Вясёлка». З сярэдзіны сямідзясятых ён удзельнік шматлікіх выставак, у тым ліку ў ГДР, Балгарыі, Югаславіі. У 1983 годзе Цішкоўскі атрымаў залаты медаль PSA ў Ганконгу з прысваеннем ганаровага міжнароднага звання «Зорны клас», а праз два гады стаў уладальнікам яшчэ аднаго такога ж медаля ў ЗША. У 1988-м быў ушанаваны ганаровым званнем AFIAP. У альбоме «Фатографы з СССР», які быў выдадзены ў ГДР, яго прозвішча значыцца сярод сямі найлепшых фатографаў Савецкага Саюза. Фотамайстра не стала ў 1989 годзе.



Фота Ірыны САВОСІНАЙ

Паглядзець фотавыстаўку можна будзе да 25 кастрычніка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦІ З ДЗЯЦІНСТВА!

**У калысцы гарадоў беларускіх прайшоў рэспубліканскі культурна-адукацыйны праект «Скарынаўскія дні ў Полацку — 2021» і Нацыянальны дзіцячы форум «Беларусь — краіна магчымасцяў». Яны былі прысвечаныя тэме народнага адзінства. Усяго некальк гадоў таму праект пачалі рэалізоўваць на раённым узроўні і цяпер ужо — на рэспубліканскім.**

Арганізатары — Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, упраўленне па адукацыі Полацкага райвыканкама. У горад на берагах Заходняй Дзвіны зляцеліся вучні, актывісты маладзёжных парламентаў, лідары Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі і педагогі. Усяго ўдзельнікамі маштабных мерапрыемстваў сталі каля 250 чалавек з усіх абласцей Беларусі, дыстанцыйна — прадстаўнікі Себежскага раёна Расіі, які мяжуе з Прыдзвінскім краем. Месцам правядзення форуму «Беларусь — краіна магчымасцяў» стала сярэдняя школа № 18 імя Ефрасінні Полацкай.

У рамках праекта на завочным этапе правялі конкурс касплею «Бяздоннае багацце» (касплей — пераапрананне ў касцюм абранага персанажа з наступнай імітацыяй характэрных для яго паводзін і гаворкі), паэтычны — «Адзіны духам», фота — «Макрапагляд».

Багатым на акцыі быў час, праведзены ўдзельнікамі і ганаровымі гасцямі ў самым старажытным беларускім горадзе. У прыватнасці, у гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны правялі Скарынаўскую алімпіяду сярод вучняў 9—11 класаў. Былі выпрабаванні на веды ў галіне гісторыі. Вельмі цікавымі сталі творчыя конкурсы. У прыватнасці, за перамогу змагаліся аўтары і выканаўцы экспромтаў на беларускай і рускай мовах, чытальнікі вершаў і прозы, прысвечаных беларускаму першадрукару.



Аўтсайдараў сярод канкурсантаў не мелася, таму членам журы было вельмі складана аб'явіць пераможцаў — усе ўдзельнікі прадэманстравалі высокі ўзровень падрыхтоўкі і таленты.

Насычанай стала дыялогавая пляцоўка «Моладзь. Ініцыятыва. Будучыня», у якой бралі ўдзел прадстаўнікі маладзёжных парламентаў і члены дзіцячай палаты цэнтральнага савета грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя».

Шмат карыснага пачулі слухачы «курсаў парламентарызму» для юных грамадзян... На пляцоўцы «Дзейнічаем» маладзёжны пасол Мэт устойлівага развіцця (пераможца адпаведнага конкурсу, адным з арганізатараў якіх было Міністэрства адукацыі) Яраслаў Аляксееў абмеркаваў з удзельнікамі мерапрыемства актуальныя і важныя аспекты дзейнасці рэгіянальных маладзёжных парламентаў.

Надоўга запомніцца вечарына сяброўства «Беларусь — гэта мы». Гасцям прапанавалі квэст-спаборніцтвы, цімблінг (выпрабаванні ў вяровачным «гарадку»), вельмі ахвотна бралі ўдзел у дэнс-батле.

17 верасня на цэнтральнай плошчы Полацка — Свабоды адбылася акцыя «Салют, піянеры!», прымеркаваная да Дня народнага адзінства і чарговай гадавіны самай масавай у краіне дзіцячай арганізацыі — піянерскай (пра самастойную дзейнасць піянерская арганізацыя Беларусі заявіла 13 верасня 1990 года на X Злёце піянераў Рэспублікі Беларусь, калі былі прынятыя статут, дэвіз і законы арганізацыі).

Адбыліся святочны канцэрт, цырымонія прыняцця ў шэрагі піянеры, узнагароджанне пераможцаў рэспубліканскіх конкурсаў. Удзельнікі мерапрыемства ўсклалі вянкі і кветкі на мемарыяле памяці вызваліцеляў Полацка. Адной з удзельніц акцыі стала дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Святлана Адзінцова.

Безумоўна, гаспадары не забылі паказаць адзін з самых прыгожых еўрапейскіх гарадоў. Восенню Полацк — быццам бы цудоўны лісцік на дрэве планеты. Залатыя купалы храмаў, сонейка, лісце пад нагамі — гэтыя моманты жыцця будуць у памяці ўдзельнікаў мерапрыемстваў.

Арганізатары яшчэ раз даказалі, што ў нашай краіне працягваюцца скарынаўскія традыцыі. Беларусь — краіна, дзе з павагай адносяцца да мовы, культуры, гісторыі. А ў дзяцей і моладзі ёсць шмат шанцаў раскрыць і рэалізаваць таленты, зрабіць добрую кар'еру, рэалізаваць мары.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, г. Полацк.**
**Фота дадзена арганізатарамі.**

Кантакт

# «МЫ ЗНОЎ ПРЫЕДЗЕМ ПА ПЕРАМОГУ!»

**Напярэдадні Сусветнага дня пошты, які адзначаецца 9 кастрычніка, РУП «Белпошта» на базе адпачынку «Дружба» правяло традыцыйны XXIV Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства начальнікаў, спецыялістаў па паштовай дзейнасці і аператараў аб'ектаў паштовай сувязі.**

Дадзенае мерапрыемства праводзіцца з мэтай павышэння прафесійнай кампетэнцыі і майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі, стымулявання іх творчай і дзелавой актыўнасці, павышэння статусу работнікаў паштовай сувязі, удасканалення формаў і метадаў арганізацыі працы аб'ектаў паштовай сувязі, павышэння ўзроўню якасці і канкурэнтаздольнасці паслуг, а таксама ўмацавання карпаратыўнага духу работнікаў прадпрыемства.

Нагадаем, што першы падобны конкурс прафесійнага майстэрства паштовых работнікаў быў праведзены ў 1997 годзе сярод аператараў сувязі і паштальёнаў па дастаўцы друку і карэспандэнцыі. Штогод прадпрыемства працягвае гэтую выдатную традыцыю, і ўжо больш за два дзясяткі гадоў рэспубліканскі конкурс выяўляе найлепшых прадстаўнікоў прафесіі. Для многіх удзел у конкурсе з'яўляецца пачаткам адкрыцця ўласнага патэнцыялу ў прафесійнай дзейнасці. Гэта добрая магчымасць убачыць самых яркіх прадстаўнікоў такіх прафесій, як паштальён, аператар сувязі, спецыяліст па рабоце з карпаратыўнымі кліентамі.

За мінулыя гады ў конкурсах прафесійнага майстэрства прынялі ўдзел каля 1000 работнікаў РУП «Белпошта» розных спецыяльнасцяў. Сёлетні конкурс прымеркаваны да Сусветнага дня пошты і Года народнага адзінства ў Рэспубліцы Беларусь.

Конкурсныя спаборніцтвы праводзяцца сярод спецыялістаў, якія выйгралі конкурс прафесійнага майстэрства ў абласных філіялах і вытворчасці «Мінская пошта», для таго каб пацвердзіць веды і навыкі ў практычных і тэарэтычных выпрабаваннях і, вядома, стаць пераможцамі на рэспубліканскім узроўні.

У гэтым годзе за званне найлепшых работнікаў змагаліся 42 удзельнікі. Сярод іх — начальнікі аб'ектаў паштовай сувязі, спецыялісты па паштовай дзейнасці і аператары сувязі аб'ектаў паштовай сувязі.

Дарэчы, самаму маладому ўдзельніку конкурсу споўнілася 24 гады — гэта Георгій Лагута, аператар сувязі Бабруйскага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Магілёўскага аб'яднанага цэха паштовай сувязі, а самы вопытны ўдзельнік — Ганна Куцько, начальнік АПС № 15 Віцебска.

Запаветная мара для кожнага абласнога філіяла — прывезці кубак пераможцы ў свой рэгіён. Так, у 2018-м і 2019-м гадах перамогу ў конкурсе двойчы атрымлівала каманда Мінскага філіяла.

У першы дзень конкурсу ўдзельнікі разам са сваімі камандамі прадставілі на суд журы хатняе заданне па дзвюх намінацыях, прадстаўленне каманды па тэму: «Белпошта — гэта мы. У адзінстве — сіла», а таксама дэманстравалі рэкламны відэаролік пра паслугі паштовай сувязі. У другі дзень правядзення конкурсу ад удзельнікаў патрабавалася пацвердзіць веды і навыкі ў практычных і тэарэтычных іспытах.

Днямі падвялі вынікі конкурсу і адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў. Усім удзельнікам уручаны памятныя сувеніры, а пераможцам — дыпломы, прызы і кветкі.

На цырымоніі закрыцця конкурсу **генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Святлана ЮРКЕВІЧ** звярнулася



Удзельніцы конкурсу разам з кіраўніцтвам РУП «Белпошта» і прафсаюзнай арганізацыі пасля ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання.

да фіналістаў з пажаданнямі моцнага здароўя і далейшых прафесійных поспехаў, адзначыўшы неацэнны ўклад кожнага работніка ў развіццё прадпрыемства, высокі прафесіяналізм і творчы падыход кожнага з канкурсантаў.

Старшыня журы — **намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыйнай дзейнасці Алена ДРАЗДОВІЧ** — абвясціла вынікі конкурсу, прысвечанага Сусветнаму дню пошты і Году народнага адзінства ў Рэспубліцы Беларусь. Узнагароджвалі пераможцаў, уручалі дыпломы, памятныя сувеніры, прызы і кветкі генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Святлана Юркевіч разам са старшынёй першаснай прафсаюзнай арганізацыі прадпрыемства Анжалікай Дробавай.

На вышэйшую прыступку п'едэстала паднялася каманда — пераможца Брэсцкага абласнога філіяла, якая набрала найбольшую колькасць балаў. Другое месца заняла каманда Мінскага філіяла. Трэцяе месца ў каманды Віцебскага філіяла.

— Да першага месца прадстаўнікі нашага філіяла паступова ішлі некалькі гадоў, — расказала **намеснік дырэктара Брэсцкага абласнога філіяла РУП «Белпошта» Ірына КАНДРАЦЮК.** — Напрыклад, у мінулым годзе наша каманда заняла другое месца, было ў нашым актыве і трэцяе месца. Але аб тым, каб стаць пераможцамі, мы марылі дзевяць гадоў, паколькі склад у каманды заўсёды быў вельмі моцны. Ну, а сёлета, я лічу, нам усё ж такі пашанцавала, і мы сталі лідарамі.

Хачу адзначыць, што перамагчы ў дадзеным конкурсе даволі складана. З усіх рэгіёнаў краіны сюды прыязджаюць прафесіяналы высокага класа — сапраўдныя майстры сваёй справы. Але ў гэтым годзе, на маю думку, склад каманды Брэсцкага філіяла сапраўды падабраўся выдатны. Падрыхтоўка да конкурсу была вельмі сур'ёзная. Самае галоўнае, што нашым удзельніцам атрымалася пераадолець хваляванне, справіцца з эмоцыямі, а ў выніку — доўгачаканае першае месца. Дадам, што большасць каманды — гэта спецыялісты аддзела эксплуатацыі філіяла, і калектыў у камандзе склаўся вельмі дружны. Усе нашы ўдзельніцы — сапраўдныя байцы, якія ўпэўнена ішлі да перамогі. Дарэчы, удзел у падобным конкурсе — добрая магчымасць зрабіць крок па кар'ернай лесвіцы. Напрыклад, адна з нашых удзельніц раней прыязджала на конкурс у якасці простага аператара, а сёлета яна — начальнік аддзялення паштовай сувязі. І гэта — не адзінкавы прыклад. Разумею, што перамагчы — гэта адно, а ўтрымаць лідарства значна цяжэй. Але ў наступным годзе мы зноў прыедзем на конкурс па перамогу!

— Мне прыемна адзначыць па выніках апошніх даных конкурсаў, што прафесійнае майстэрства нашых работнікаў расце год ад году, — падкрэсліла Святлана Юркевіч. — Прыемна здзівілі супрацоўнікі Брэсцкага абласнога філіяла, якія доўгі час не перамагалі, а сёлета занялі запаветнае першае месца. Відаць, што яны ўзмоцнена рыхтаваліся, пастаянна павышалі ўзровень прафесійнага майстэрства і ў выніку сталі лідарамі спаборніцтва. Гэтая каманда вартая такога высокага месца.

Па словах Святланы Віктараўны, сённяшнія аператары з гонарам называюцца спецыялістамі паштовай сувязі. І гэта зусім не дзіўна — той вялізны пералік паслуг, якія яны аказваюць, патрабуе шырокіх ведаў, а яшчэ — уменне мець зносіны з людзьмі, што патрабуецца ад кожнага работніка пошты. А гэта задача не з лёгкіх.

— На працягу конкурсу нашы работнікі не проста прадэманстравалі свой высокі прафесіяналізм, а праявілі сапраўдную крэатыўнасць, — адзначыла генеральны дырэктар. — Яны паказалі, што могуць спяваць, танчыць, здымаць цікавыя відэаролікі і нават разыгрываць вясёлыя сцэнкі. І, галоўнае, усе яны ўдзельнічалі ў конкурсе з радасцю, з добрым настроем. А гэта вельмі дапамагае згуртаваць калектыў.

Святлана Юркевіч лічыць, што падобныя конкурсы як нельга лепш дапамагаюць росту прафесіяналізму супрацоўнікаў. Дзе яшчэ можна даведацца аб цікавых асаблівасцях работы, абмяняцца вопытам з калегамі, вызначыць нестандартныя шляхі вырашэння праблем? Касцяк кожнай каманды — гэта сплаў вопыту і маладосці, што таксама спрыяе павышэнню ўзроўню прафесійных ведаў. Сёння на пошце аказваецца шмат тэхналагічных паслуг, а гэта патрабуе ад людзей новага мыслення, шырокіх ведаў. І тое, што калектывы паштовых аддзяленняў штогод папаўняюцца новымі маладымі супрацоўнікамі, безумоўна, радуе. Напрыклад, у сталіцы амаль 80 % работнікаў — моладзь.

— Мне хочацца шчыра падзякаваць усім нашым работнікам, — дадала генеральны дырэктар. — Работа наша вельмі няпростая і нават цяжкая. Працаваць даводзіцца і па выхадных, і ў святы. І разам з гэтым ніхто з іх не падае духам, усе выконваюць свае абавязкі адказна, добрасумленна, якасна. Незалежна ад месца работы — ці гэта вясковае аддзяленне, РВПС альбо абласны філіял. Дзякуй усім вам за гэта!

«Звязда» далучаецца да віншаванняў, няхай нашым заўсёдным памочнікам шчасціць — і на працы, і дома.

**Сяргей РУЧАНАЎ, фота аўтара.**

# Беларускія фільмы на Ташкенцкім кінафестывалі

**28 верасня ў сталіцы Узбекістана, Ташкенце, распачне сваю работу XIII Ташкенцкі міжнародны фестываль з па-ўсходняму прыгожай назвай — «Жамчужына Шаўковага шляху». Мерапрыемства, статус якога пазначаны як «Фестываль фестываляў», мае стаць значнай падзеяй у сусветнай кінаіндустрыі. Мяркуецца, што на ім збяруцца ўдзельнікі з больш чым сарака краін. На пляцоўках па ўсёй краіне на працягу некалькіх дзён будуць дэманстравацца найлепшыя фільмы еўрапейскіх і азіяцкіх кінематаграфістаў.**

Удзел у фестывалі будзе прымаць і беларуская дэлегацыя на чале з дырэктарам Нацыянальнай студыі «Беларусьфільм» Уладзімірам Карачэўскім. Паводле яго слоў, беларускае кіно на фестывалі будзе прадстаўлена рознымі жанрамі. «Гледачы ўбачаць ваенную драму Дзмітрыя Астрахана «Лёс дыверсанта», фільм «Авантуры Пранціша Вырвіча», які мы называем «беларускія «Гардэмарыны», «Правілы геймера» — сучаснае сямейнае прыгодніцкае кіно, фільм Мітрыя Сямёнава-Алейнікава «Франка» з альманаха «Вайна. Застацца чалавекам» — развагу аб антыгуманнасці любой вайны, — распавёў кіраўнік Нацыянальнай кінастудыі. — На конкурс дакументальнага кіно наша праслаўленая Галіна Адамовіч прывязе работу "Вяда". Акрамя таго, у насычанай праграме фестывалю запланаваныя майстар-класы, прэзентацыі, круглыя сталы, у якіх мы таксама мяркуем прымаць удзел».

Падчас Дня беларускага кіно ў рамках фестывалю нашы фільмы ўбачаць не толькі на кінапляцоўках Ташкента, але і Самарканда, і Сардар'і. Дакументальнае кіно будзе дэманстравацца ў Хіве. Надзвычай цікавым абяцае быць конкурс маладых кінамайстроў «Кіно за пяць дзён». Яго ўдзельнікі за пяць дзён да пачатку фестывалю накіраваліся ў розныя куткі Узбекістана, каб за гэты час зняць фільм, прысвечаны тэме Вялікага шаўковага шляху. Найлепшыя работы будуць прадэманстраваны падчас фестывалю. У гэтым даволі экстрэмальным конкурсе беларусы таксама ўдзельнічаюць — нашу краіну прадстаўляе Мітрый Сямёнаў-Алейнікаў.

Мяркуецца, што падчас фестывалю адкрыецца філіял Усерасійскага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі ў Ташкенце. Для наладжвання міжнародных адукацыйных сувязяў туды едзе дэкан факультэта экранных мастацтваў Беларускай акадэміі мастацтваў Павел Іваноў. Увогуле, наладжванне сувязяў — адна з асноўных мэт паездкі нашай дэлегацыі. Уладзімір Карачэўскі заўважыў, што спадзяецца пазнаёміцца з патэнцыйнымі ўдзельнікамі Мінскага міжнароднага фестывалю «Лістапад» — з гэтага года нацыянальная кінастудыя з'яўляецца галоўным падрадчыкам па арганізацыі мерапрыемства. У планах таксама — падпісанне дамоўленасцяў з узбекскімі калегамі, што прывядзе на «Беларусьфільм» цікавыя творчыя праекты.

Аб усім гэтым падрабязней — у нашых навінах з першых вуснаў: «Звязда» таксама будзе на фестывалі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# КАРАТКЕВІЧ НА КІТАЙСКАЙ — У МАСКОЎСКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ

**Усерасійская дзяржаўная бібліятэка замежнай літаратуры імя М. І. Рудаміно (Масква, вул. Нікаляямская, д. 1) у межах 34-га Маскоўскага міжнароднага кніжнага кірмашу прыняла дэлегацыю Рэспублікі Беларусь.**

На сустрэчы з кіраўніцтвам славутай асветніцкай установы, заснаванай у 1922 годзе, ішла размова пра наладжванне стасункаў з пісьменнікамі і кнігавыдаўцамі Беларусі. У бібліятэцы праводзіцца мноства мерапрыемстваў, падчас якіх прэзентуюцца навінкі кнігавыдання. Сюды з вялікай ахвотай ідуць паслы розных краін, якія працуюць у Маскве, даследчыкі, якія вывучаюць літаратуры розных краін.

У бібліятэцы працуе Цэнтр славянскіх культур, дзе ёсць і збор беларускіх кніг. А ў час гэтай сустрэчы госці з Мінска падарылі некалькі асобнікаў кітайскага выпуску часопіса «Беларусь» з публікацыяй урыўка з аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» ў перакладзе на кітайскую мову. Перакладчык — Сунь Фаньці. Гаспадары зазначылі, што бібліятэка імя М. І. Рудаміно праз усю сваю гісторыю якраз і спрыяе паяднанню культур, літаратур, розных моў і народаў.

— Спадзяюся, што гэта не апошняя сяброўская сустрэча беларусаў і расіян у сценах славутай бібліятэкі, — зазначыў старшыня ФНКА «Беларусы Расіі» Сяргей Кандыбовіч, які таксама прыняў удзел у імпрэзе. — У нас ёсць усе падставы зрабіць болей шырокімі стасункі паміж кніжнікамі Беларусі і Расіі.

**Раман СЭРВАЧ.**

# ЛІЧБАВАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ НА ЎСІХ УЗРОЎНЯХ


Фота БелТА.

## Празрыстасць праз лічбы

Да канца года рэгіянальныя мерапрыемствы, разлічаныя на ўдзел прадстаўнікоў дзяржорганаў і арганізацый, малога і сярэдняга бізнесу і банкаўскай сферы, пройдуць ва ўсіх абласных цэнтрах краіны. Першае ўжо стартавала ў Гомелі.

Лічбавізацыя і камунікацыйна-інфармацыйныя тэхналогіі ў Гомельскай вобласці прысутнічаюць практычна ў кожнай сферы: ад эканомікі да сацыяльнай галіны. Гамяльчане, напрыклад, першымі ў Беларусі адкрылі дзіцячы тэхнапарк на базе дарослага.

*— Сёння мы актыўна ўдзельнічаем у лічбавым і электронным урадзе. Электронны бюлетэнь і электронны дзённік ужо сталі звыклай справай для вобласці. Мы распрацоўваем шматлікія праекты з «Гомсельмашам», у прыватнасці па ўкараненні датчыкаў дыстанцыйнай перадачы даных на камбайны вытворчасці гэтай арганізацыі. Выходзім на дыстанцыйнае кіраванне электроннымі прыладамі з мясцовай ЖКГ. Разам з Нацыянальным цэнтрам электронных паслуг працуем над удасканаленнем другой чаргі сэрвісу «адно акно». Сур'ёзна ставімся да рэалізацыі задач «разумны дом» і «разумны горад»,* — падкрэсліла **Алена КЛІЧКОЎСКАЯ, кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама.**

Форум створаны для абмеркавання стану і развіцця электроннай будучыні Беларусі і скіраваны на перавод узаемадзеяння на ўсіх узроўнях у лічбавую плоскасць, абазначыў **Аляксей ЦЫМБАЛАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам**:

*— Гэта, прынамсі, павышэнне ўзроўню ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадства, якое заснавана на выкарыстанні сучасных тэлекамунікацыйных і інфармацыйных тэхналогій. Павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання і змяншэнне выдаткаў сацыяльных камунікацый для кожнага члена грамадства з выкарыстаннем высокіх тэхналогій. Аптымізацыя ўзаемадзеяння грамадзян, бізнесу, чыноўнікаў з мэтай дасягнення больш высокага ўзроўню адкрытасці, празрыстасці і хуткасці стасункаў.*

## Смарт-платформа і дзяржаўнае воблака

Акрамя таго, форум — гэта яшчэ і вельмі важная дыялогавая пляцоўка, якая дазволіць стваральнікам воблачных тэхналогій стаць бліжэй да спажыўца, абмеркаваць пытанні лічбавай трансфармацыі і даведацца, што патрэбна людзям. Такая зваротная сувязь ад бізнесу, грамадзян і арганізацый дазваляе адпавядаць патрабаванням часу пры стварэнні новых прадуктаў, падкрэсліў **Алег СЯДЗЕЛЬНІК, генеральны дырэктар Беларускіх воблачных тэхналогій.**

Сярод ужо рэалізаваных праектаў кампаніі — адзіная рэспубліканская сетка перадачы даных, сетка сувязі чацвёртага пакалення, дзяржаўнае рэспубліканскае воблака для размяшчэння дзяржаўных інфармацыйных сістэм. Больш за 700 арганізацый, дарэчы, ужо размясцілі свае рэсурсы на воблаку. З боку іншых дзяржарганізацый ідзе ацэнка магчымасці пераносу сюды сваіх сістэм.

*— Маючы падобную інфраструктуру, мы проста абавязаны развіваць і прапаноўваць новыя рашэнні,* — падкрэсліў Алег Сядзельнік. *— Адно з іх — смарт-платформа, з дапамогай якой плануем звесці ў адзінае цэлае разумныя тэхналогіі, каб сферы ЖКГ, машынабудаўніцтва, транспарту, медыцыны маглі выкарыстоўваць сістэмы штучнага інтэлекту. Плануем дапамагаць прадпрыемствам, якія займаюцца развіццём муніцыпальнага транспарту, каб і яны ў межах палігонаў, на якіх сертыфікуюцца машыны і тэстуюцца тэхналогіі, маглі выкарыстоўваць усе тэхналогіі сувязі, каб заставацца канкурэнтаздольнымі.*

Актуальнасць і значнасць адукацыйных праграм у сферы інфармацыйнай бяспекі ўзрастае з развіццём лічбавых і тэлекамунікацыйных тэхналогій. Інфармацыя — адзін з найважнейшых і найкаштоўнейшых актываў любога прадпрыемства, таму паўстае пытанне аб яе належнай ахове, заўважыў дырэктар Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам:

*— Развіццё інтэрнэту і спадарожных тэхналогій стварае мноства магчымасцяў для кіберзлачынцаў, таму мэта нашых курсаў — падрыхтаваць спецыялістаў у сферы IT для аперацый у кібер-прасторы ў самых розных сферах. Курсы актуальныя для супрацоўнікаў і дзяржсектара, і бізнесу. Да канца года на базе створанага адукацыйнага цэнтра мы плануем навучыць больш за тысячу абанентаў.*

## Права быць забытым

Лічбавізацыя — агульнасусветны трэнд. Лічбавая трансфармацыя, укараненне электроннага ўраду, трансгранічнага абмену інфармацыяй немагчымы без прытрымлівання заканадаўства аб персанальных даных, перакананы **Мікалай САВАНОВІЧ, начальнік аддзела канстытуцыйнага права Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў:**

*— Сёння агульнапрынятым тэзісам з'яўляецца сцвярджэнне, што персанальныя даныя ва ўмовах інфарматызацыі, лічбавізацыі ўсіх бакоў дзяржаўнага і грамадскага жыцця становяцца «новай нафтай». Яны з'яўляюцца зместам інфармацыйных рэсурсаў і сістэм. Вельмі важна, каб распрацоўшчыкі новых элементаў электроннага ўрада, новых інфармацыйных сістэм, якія ўкараняюцца як у дзяржаўным кіраванні, так і ў прыватнай сферы, прытрымліваліся патрабаванняў заканадаўства аб персанальных даных. Гэта дазволіць у будучыні пазбегнуць розных няўзгодненасцяў пры рэалізацыі падобных маштабных інфраструктурных праектаў з заканадаўствам.*

15 лістапада ўступіць у сілу Закон аб ахове персанальных даных, прыняты ў маі. Гэта першы вопыт комплекснага рэгулявання азначанага пытання ў нашай краіне. Ён надзяліць грамадзян шэрагам правоў, якіх у іх цяпер няма. У тым ліку так званае права быць забытым, права патрабаваць спынення апрацоўкі персанальных даных (калі няма юрыдычнай падставы на іх апрацоўку) і іх выдалення.

Вельмі важным для эфектыўнага прымянення гэтага закона становіцца і стварэнне спецыялізаванага органа, які будзе займацца кантролем і кіраваннем у сферы аховы персанальных даных. Замежны вопыт паказвае, што толькі там, дзе ёсць спецыялізаваныя органы з шырокім колам паўнамоцтваў, падобныя законы ўкараняюцца ў жыццё, а не застаюцца на паперы, падкрэсліў Мікалай Савановіч:

*— Увогуле, задача закона — знайсці баланс паміж канстытуцыйным правам чалавека на ахову сваіх даных і магчымасцю арганізацый развіваць інфармацыйныя паслугі і рэсурсы, у тым ліку тыя, што збіраюць персанальныя даныя. Для насельніцтва гэты закон створыць дадатковую гарантыю аховы персанальных даных, інфармацыі прыватнага жыцця. Грамадзяне атрымаюць, напрыклад, права бясплатна раз на год патрабаваць ад аператара звесткі, хто на працягу года меў доступ да яго персанальных даных на пэўным інфармацыйным рэсурсе.*

## Электронны ўрад, подпіс і кабінет

Інфраструктура электроннага ўрада ў краіне створана. Цяперашняя задача — яе разгортванне і ўдасканальванне, а таксама нарошчванне сэрвіснага складніка, падкрэсліў **Раман ГРАДУСАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:**

*— З 1 верасня ў Беларусі пачалося ўкараненне біяметрычных дакументаў, у прыватнасці ўнутранага пашпарта беларуса — ID-карткі. Асноўная яе адметнасць — запісаны на чыпе карткі крыптаграфічны дадатак — электронна-лічбавы подпіс (ЭЛП). Дагэтуль носьбітамі ЭЛП з'яўляліся толькі сім-карткі ці флэш-носьбіты. Колькасць лічбавых подпісаў такім чынам неўзабаве павялічыцца ў разы.*

Дагэтуль на адзіным партале электронных паслуг быў рэалізаваны ўласны кабінет кожнага грамадзяніна. Кабінет актывізуецца пасля першага ўваходу ў яго чалавека, які выкарыстоўвае для гэтага свой ЭЛП.

На партале рэалізавана ўжо больш за 200 электронных сэрвісаў, 61 з якіх — адміністрацыйныя працэдуры. Летась было аказана крыху больш за 6,5 млн электронных паслуг, сёлета — ужо больш за 8 млн. Штодня аказваецца каля 35 тысяч электронных паслуг і 200 адміністрацыйных працэдур.

*— На жаль, некаторыя адміністрацыйныя працэдуры немагчыма алічбаваць — чалавеку давядзецца прад'яўляць пэўныя дакументы, з якімі ён мусіць прыходзіць фізічна, каб атрымаць працэдуру. Аднак большасць іх усё ж магчыма перавесці ў электронны фармат, — адзначыў дырэктар цэнтра. — Паступова колькасць адмінпрацэдур будзе змяншацца, а іх электронная колькасць павялічвацца. Аднак гэта будзе не чыстая алічбоўка, а перагляд усяго комплексу мерапрыемстваў у сферы аказання пэўных працэдур.*

Адна з новых змен — распрацоўка і развіццё так званых суперсэрвісаў, калі чалавеку паслуга будзе аказвацца ў залежнасці ад яго жыццёвай сітуацыі: нараджэнне дзіцяці, рэгістрацыя як бізнес-асобы і іншыя абставіны, якія адсочыць сама дзяржава.

**Ірына СІДАРОК.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

# ПОПЫТ ПЕРАВЫШАЎ ПРАПАНОВУ

**Як прайшла летняя аздараўленчая кампанія ў беларускіх санаторыях і дзіцячых лагерах?**

**Сёлетнім летам попыт на пуцёўкі ў беларускія санаторыі перавышаў прапанову. З пачатку года ў нашых здраўніцах адпачыла 975 тысяч чалавек, з іх амаль 40 працэнтаў — замежнікі, прычым пераважную большасць складалі расіяне. Эксперт паслуг, адпаведна, удалося нарасціць. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што сітуацыя паляпшаецца ў параўнанні з мінулым годам, калі пандэмія прымусіла працаваць санаторыі ледзь не ў рэжыме выжывання і нават часова закрываць іх. Але варта заўважыць, што і сёлета выпадкі COVID-19 не абмінулі беларускія здраўніцы.**



— Запаўняльнасць санаторыяў у летнія месяцы дасягнула максімальных значэнняў і склала сёлета 80 працэнтаў, што адпавядае патрабаванням часовых рэкамендацый па прафілактыцы COVID-19, — кажа **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.** — Адначасова ў здраўніцах па ўсёй краіне аздараўлівалася каля 20 тысяч чалавек, з іх 3-3,5 тысячы — замежнікі. Колькасць выяўленых выпадкаў каранавіруснай інфекцыі сярод адпачывальнікаў і персаналу — некалькі дзясяткаў, што дазваляла не спыняць работу санаторна-курортных устаноў.

Такім чынам, дзякуючы ўдаламу лету запаўняльнасць за студзень — верасень вырасла ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 16 пунктаў і складае 75 працэнтаў. Агульная колькасць тых, хто атрымаў сёлета магчымасць аздаравіцца, падрасла амаль на палову і склала 975 тысяч чалавек. Колькасць пуцёвак у вольнай рэалізацыі павялічылася на 39 % і склала 430 тысяч. Экспарт паслуг падрос на 39 працэнтаў, а сума выручаных ад яго сродкаў склала больш за 102 мільёны рублёў (летась — 73 мільёны).

Сёлета ў нашых санаторыях пабывалі прадстаўнікі амаль чатырох дзясяткаў краін, аднак з далёкага замежжа па зразумелых прычынах былі адзінкі.

— Ва ўмовах закрытых граніц і нявызначанасці, у чырвонай ці зялёнай зоне па COVID-19 знаходзіцца наша краіна, расійскія грамадзяне складалі большасць замежнікаў. Усходнія суседзі, для якіх не было ніякіх перашкод, дазволілі нам захаваць экспартны патэнцыял, — адзначае Генадзь Балбатоўскі.

Аднак менавіта пандэмія дазволіла здраўніцам максімальна аднавіць матэрыяльна-тэхнічную базу. У 2020 годзе невысокая запаўняльнасць дазваляла займацца рамонтам і рэканструкцыяй. На гэтыя мэты было выдаткавана 108 мільёнаў рублёў (для параўнання: у 2019-м — 78 мільёнаў).

— Санаторна-курортныя ўстановы зарабілі каля 600 мільёнаў, з іх 108, а гэта шостая частка, выдаткавалі на развіццё ўласнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, і гэта вельмі добры вынік. Штогод дынаміка тут складае 15—20 працэнтаў, — адзначае суразмоўнік.

Што датычыцца дзіцячага аздараўлення, то пуцёўкамі ў лагеры сёлета былі забяспечаны ўсе ахвотныя. На летнюю кампанію гэтага года было выдаткавана больш за 46 мільёнаў рублёў, што дазволіла адпачыць 345 тысячам школьнікаў. А гэта каля трэці ўсіх юных беларусаў. Для параўнання: у мінулым годзе ў лагерах адпачыла ўсяго 173 тысячы дзяцей.

У краіне працавала 5809 лагераў розных тыпаў. Сярод адпачывальнікаў была вялікая катэгорыя дзяцей-інвалідаў (4800) і дзяцей-сірот (каля 11,5 тысячы). На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы патрацілі больш за 12,5 мільёна рублёў.

— Летняя кампанія прайшла без успышак захворванняў. Сярод 345 тысяч дзяцей мы зафіксавалі ўсяго каля 80 завозных выпадкаў COVID-19 у лагерах з дзённым знаходжаннем і 24 — у кругласутачных. Усе яны абышліся без цяжкага цячэння і далейшага распаўсюджвання інфекцыі, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі.

Усе лагеры працавалі з улікам новых метадычных рэкамендацый па папярэджанні COVID-19. Яны не такія жорсткія, як леташнія, якія прадугледжвалі вахтавы метад работы педагагічных і медыцынскіх работнікаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# НЯСПЫННЫ РУХ

**Асаблівасць алімпійскага руху ў тым, што ён ніколі не спыняецца. Увесь час адбываецца нешта новае і цікавае. А на фоне гэтага — чаканне, прадчуванне і падрыхтоўка да наступных, самых лепшых і самых цікавых, Алімпійскіх гульняў.**

**1.** Выканаўчы камітэт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі абмеркаваў падрыхтоўку да зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Выканкам НАК зацвердзіў пастаўшчыка спартыўнай экіпіроўкі на зімовую Алімпіяду. Выканаць тэхнічнае заданне на неабходным узроўні гатова кампанія «Сола-Пінск». Прадпрыемства ўжо супрацоўнічала з Нацыянальным алімпійскім камітэтам пры падрыхтоўцы да II Еўрапейскіх гульняў у Мінску і Алімпійскіх гульняў у Токіа.

**2.** Алімпійскія вёскі для спартсменаў на зімовых Алімпійскіх гульнях у Пекіне 2022 года будуць высокатэхналагічнымі, экалагічнымі і ўтульнымі, абяцаюць арганізатары. Аб'екты будуць размешчаныя ў трох кластарах. Кампус у Яньцыне прымяняе тэхналогіі звышнізкага энергаспажывання для стварэння камфортных умоў, дзякуючы падтрыманню тэмпературы ад 20 да 26 градусаў. Падчас будаўніцтва вёскі ўлічваліся экалагічныя стандарты і мінімальная шкода прыродзе. У агульнай зоне вёскі ўстаноўлены тры вялікія экраны, з дапамогай якіх спартсмены змогуць атрымаць разнастайную інфармацыю, у тым ліку аб навакольным асяроддзі, бяспецы і паслугах. Арганізатары расказалі і аб адным з самых важных прадметаў мэблі ў пакоях — ложках. Яны не толькі зручныя і трывалыя, але і здольныя трансфармавацца. З дапамогай пульта дыстанцыйнага кіравання можна адрэгуляваць ложак у адпаведнасці з рознымі функцыямі: для адпачынку, чытання ці работы на ноўтбуку.

**3.** Арганізатары Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў у Пекіне — 2022 прадставілі дэвіз спаборніцтваў, паведамляе афіцыйны сайт аргкамітэта. Дэвізам будучага мультыспартыўнага форуму стаў выраз «Разам дзеля агульнай будучыні».

«Дэвіз Гульняў адлюстроўвае цвёрдае імкненне людзей пераадольваць цяжкасці. Гэта пазіцыя і ініцыятыўны план дзеяння для сумеснай работы ў імя лепшай будучыні», — гаворыцца ў рэлізе. Таксама аргкамітэт прадставіў серыю постараў, прысвечаных галоўным стартам. А талісманам Алімпіяды стане панда Бінь Дунь Дунь.

**4.** У Пекіне стартавала глабальная рэкламная кампанія пад назвай «Характар Вялікай Кітайскай сцяны 2021 года — Пекінскае зімовае хараство», якая накіравана на папулярызацыю зімовага турызму ў Пекіне ў розных аспектах: лядовыя і снежныя віды спорту, культурныя выстаўкі і прадстаўленні, мясцовая кухня і народныя зімовыя звычаі.

Былі прадстаўлены тры турыстычныя маршруты: «Вывучэнне двайнога алімпійскага горада Пекіна», «Прыродны тур каля падножжа Вялікай Кітайскай сцяны» і «Паездка ў снежны горад Чжанцзякоў». Пазнаёміцца з гэтымі маршрутамі турысты змогуць падчас Алімпійскіх гульняў у кітайскай сталіцы.

**5.** Алімпійскія віды спорту, якія прадстаўлены на III Еўрапейскіх гульнях, будуць кваліфікацыйнымі да Алімпійскіх гульняў у Парыжы 2024 года. Пра гэта заявіў на пасяджэнні выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў (ЕАК) прэзідэнт Спірас Капралас.

Адзначаецца, што ў праграму III Еўрапейскіх гульняў у Кракаве ўключаны 23 віды спорту: фехтаванне, настольны тэніс, бадмінтон, сучаснае пяцібор'е, брэйкінг, дзюдо (камандны турнір), таэквандо, веслярны слалам, каратэ, пляжны гандбол, бокс, стральба з луку, тайскі бокс, стралковы спорт, трыятлон, скалалажанне, веласпорт, баскетбол 3х3, настольны тэніс, падзел, тэкбол, скачкі на лыжах з трампліна, пляжны футбол і кікбоксінг.

Пераадоленне

# Сярэбраны сюрпрыз Ягора Шчалканава

**Параалімпійскія гульні ў Токіа... У басейне «Акватык-цэнтра» пачынаюцца спаборніцтвы на 100 метраў на спіне сярод спартсменаў катэгорыі S9. У паветры, як заўсёды, лунае нервовае напружанне, азарт барацьбы і чаканне вынікаў. Менш чым за дзве хвіліны ўсё заканчваецца. На другой прыступцы п'едэстала з вынікам 1 хвіліна 1,96 секунды — беларус Ягор ШЧАЛКАНАЎ. Яго сярэбраны медаль стаў вельмі прыемным сюрпрызам для ўсіх — трэнераў, кіраўніцтва, балельшчыкаў. А што пра гэтае думае сам трыумфатар Ягор Шчалканаў, ён расказаў «Звяздзе».**

«Параалімпійскія гульні пакуль — галоўны старт у маім жыцці. Было цяжка, адчувалася хваляванне. Ціснулі думкі, што гэта самыя важныя спаборніцтвы, што мы доўга рыхтаваліся і не хацелася выступаць дрэнна. Стараўся не думаць аб гэтым», — расказвае Ягор. Але непасрэдна ў басейне статус і важнасць турніру не адчуваліся — не было гледачоў на трыбунах. І няхай падчас заплыву спартсмены не звяртаюць увагі на трыбуны, падтрымка ўсё ж такі мае значэнне.

**«У розных басейнах плыўцы па-рознаму адчуваюць ваду. Адрозніваецца тэмпература і, што парушае ўсе правілы фізікі, шчыльнасць вады».**

Ціску дадавала і ўсім вядомая праблема — пандэмія каранавіруса. Нават строгія эпідэміялагічныя абмежаванні не выратавалі беларускую каманду ад гэтай навалы. Перад самым стартам станоўчыя тэсты аказаліся ў плыўцоў Максіма Вашкевіча і Рыгора Зудзілава, які быў суседам Ягора Шчалканава па пакоі. «Я жыў з чалавекам, у якога аказаўся станоўчы вынік тэста на каранавірус. У Рыгора былі ўсе сімптомы: тэмпература, кашаль. І я кожны дзень прачынаўся з думкай: хоць бы ў мяне не было станоўчага тэста. Калі хварэе тры чалавекі, лічыцца, што ў камандзе павышаная небяспека. А ў нас хварэлі двое. Таму мы былі вельмі ўважлівыя, кожны дзень здавалі тэсты, пастаянна ўсё апрацоўвалі антысептыкам. Думкі аб тым, што я прыехаў у Токіа пахварэць, былі цяжкімі, канешне», — успамінае Ягор.

## НЕ ТУРЫСТАМ ЕХАЦЬ

На чэмпіянаце Еўропы 2021 года, які стаў кантрольнай праверкай сіл перад Параалімпійскімі гульнямі, Ягор вызначыўся «бронзавым дублем». Бронзавыя медалі ён заваяваў на дыстанцыях 100 метраў на спіне і 100 метраў батэрфляем. Але на Параалімпійскіх гульнях такі поспех упэўненасці не дадаваў. Як тлумачыць Ягор, у Токіа прыехала шмат моцных плыўцоў не з еўрапейскіх краін — ЗША, Аўстраліі. Таму адразу было зразумела, што канкурэнцыя чакаецца значна вышэйшая.

«Я не разлічваў, што вярнуся дадому з узнагародай. Але ведаў, што буду за яе біцца. Інакш які сэнс, калі не змагацца? Не гледачом, не турыстам туды ехаць. Гэта такі ж старт, толькі больш сур'ёзны. А работа такая ж, як і на іншых спаборніцтвах», — дзеліцца Ягор.

У Токіа спартсмен праплыў чатыры дыстанцыі. На 50 метраў вольным стылем Ягор паказаў вынік 25,96 секунды і законным выступленне на восьмым месцы. «Тое, што, на думку абываццеляў, «крыху не атрымалася», для нас — правал. Я не разлічваў, што выйду ў фінал на 50 метраў. Але так аказалася, што я апошнім адабраўся ў фінал і ўжо ставіў сабе задачу выплыць з 26 секунд. Іншых задач не ставіў, бо на 50 метрах вельмі сур'ёзная канкурэнцыя. І я быў задаволены, што выплыў з 26 секунд», — адзначае Ягор. І тлумачыць, што дыстанцыя ў 50 метраў — сапраўдная латарэя. Адзін няправільны грабок, рух, несвоечасовы ўздых — і маеш зусім іншы вынік.

У спаборніцтвах на 200 метраў комплексам Ягор спыніўся за крок ад п'едэстала. Ён называе гэтую дыстанцыю самай цяжкай. Два тыдні работы без выхадных нагадалі аб сабе. Дыстанцыя ў 100 метраў батэрфляем прынесла Ягору сёмае месца ў выніковым пратаколе. І за гэты вынік яму крыўдна: «Калі б я скінуў са свайго найлепшага выніку тры дзясятыя секунды, то можна было б змагацца за трэцяе месца. Гэта 200 метраў комплексам крыху вінаваты. Я там выклаўся на 200 працэнтаў, і, калі плыў 100 батэрфляем, мне было цяжка, бо я да канца не аднавіўся. Цяжка давалася да канца трымаць тэмп. Гэта была апошняя дыстанцыя, і я ў прынцыпе стаміўся», — тлумачыць Ягор. Дарэчы, найлепшы спосаб аднавіць арганізм паміж заплывамі — гэта сон. Спартсмен раіць выкарыстоўваць гэты спосаб для адпачынку пасля любых нагрузак.

«Сярэбраная» дыстанцыя ў 100 метраў на спіне стала сюрпрызам і для самога Ягора. Аказваецца, гэта не зусім яго профіль, і прычым нягледзячы на «бронзу» чэмпіянату Еўропы. «Я не плаваў гэтую дыстанцыю раней. Першы раз я праплыў яе ў 2019 годзе, і мы тады вырашылі, што спіна — гэта не маё. Я і не трэніраваў яе. Пакуль аднойчы на чэмпіянаце Беларусі не паказаў сярэдні вынік. І вырашылі паспрабаваць заявіць гэту дыстанцыю на чэмпіянат Еўропы. Там у кваліфікацыі атрымалася нядрэнна, потым у фінале трэцяе месца. Трэніраваў гэтую дыстанцыю і на параалімпіяду. Але чаму там усё так добра атрымалася, я растлумачыць не магу», — дзеліцца сярэбраны прызёр Параалімпійскіх гульняў на дыстанцыі 100 метраў на спіне.

Цікавы факт — у розных басейнах плыўцы па-рознаму адчуваюць ваду. Адрозніваецца тэмпература і, што парушае ўсе правілы фізікі, шчыльнасць вады. «Бывае, што рука проста слізгае па вадзе. А бывае, што прыходзіцца літаральна чапляцца за ваду. Мне падабаецца вада ў нашым басейне ў БДУФК. І ў Токіа яна была прыкладна такая», — расказвае Ягор.



## КАНТРАЛЯВАЦЬ СВАЕ ЭМОЦЫІ

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па плаванні Генадзь Вішнякоў адзначаў, што маладому, але перспектыўнаму Ягору Шчалканаву думаць аб медалях Токіа рана, яго Параалімпіядай будзе Парыж у 2024 годзе. Але, як той казаў, хочаш рассмяшыць Бога, раскажы яму пра свае планы. На шчасце, Ягор чаканні трэнера не апраўдаў. І гэта не вельмі дзіўна. Як адзначаў той жа Генадзь Вішнякоў, за апошнія паўтара года Ягор паказаў відавочны прагрэс. У чым сакрэт — не ведае нават сам спартсмен. Як звычайна працаваў, трэніраваўся, а вынікі паляпшаліся: «Не магу сказаць, што зрабіў нешта выключнае, і ў мяне пачалі расці вынікі. Дзякуй трэнерам Генадзю Вішнякову і Станіславу Паздзеяву. Магчыма, я стаў больш адказна ставіцца да працы. Зразумеў, што ўсё залежыць ад мяне самога і за мяне ніхто нічога рабіць не будзе». Магчыма, сакрэт прагрэсу Ягора Шчалканава, сапраўды, у псіхалогіі. Калі гэта так, то дзякуй за гэта варта сказаць сябру па камандзе Уладзіміру Ізотаву. «Свой першы сур'ёзны міжнародны старт, чэмпіянат свету ў Лондане, я праваліў. На 50 метрах мне не хапіла чатырох сотых секунды да медаля. І Вова крыху папрацаваў са мной, падтрымаў маральна-псіхалагічна. Дзякуючы яму я навучыўся кантраляваць свае эмоцыі, стаў больш упэўненым. Вова мне дапамог, зарадзіў мяне. Раней, выходзячы на старт, я думаў, што сапернікі мацнейшыя, таму ў мяне нічога не атрымаецца. А цяпер я аб гэтым не думаю. Цяпер мае думкі скіраваны на тое, што я не горшы за сапернікаў і таксама магу добра выступіць», — дзеліцца Ягор.

Нацыянальная параалімпійская зборная па плаванні — вельмі дружная каманда. Сябры ў басейне — сябры па-за яго межамі.

## КАР'ЕРА ПАЧАЛАСЯ З АКВАЛАНГА

Спартыўная кар'ера ў Ягора Шчалканава пачалася па традыцыйным сцэнарыі. У дзяцінстве займаўся рознымі відамі спорту, з мамай хадзіў у басейн. Пакуль у адзін цудоўны дзень у кампаніі дзеда і таты хлопчык не прыйшоў у новы Брэсцкі палац водных відаў спорту. Дзед, вялікі аматар паняраць з аквалангам, прапанаваў унуку такую ідэю. У басейне Ягора заўважыў трэнер Уладзімір Маслій, які і адкрыў Ягору дзверы ў вялікі спорт. Праўда, як расказвае сам Ягор, тады заняткі плаваннем успрымаў проста як дадатковыя пасля школы, вялікай кар'еры рабіць не імкнуўся. Проста трэніраваўся ў сваё задавальненне. Першы буйны поспех прыйшоў у 2016 годзе. Тады 15-гадовы Ягор Шчалканаў на Сусветных юнацкіх гульнях IWAS (Сусветныя юнацкія гульні Міжнароднай федэрацыі калясачнікаў і ампутантаў) заваяваў тры медалі. «Гэта больш фізіялагічныя здольнасці. Мне было 15 гадоў, арганізм расце, і вынікі растуць», — заўважае Ягор.

Затым было запрашэнне ў нацыянальную каманду, пераезд у Мінск і разуменне, што плаванне — гэта не проста хобі. Дарэчы, хобі Ягора таксама звязаны са спортам — аматарскі футбол, валейбол з сябрамі ў двары. Захапляецца хлопец і японскай культурай, гісторыяй, аўтамабілямі. Таму прыехаць у Токіа і не мець магчымасці бліжэй пазнаёміцца з краінай было крыўдна.

**«Найлепшы спосаб аднавіць арганізм паміж заплывамі — гэта сон. Спартсмен раіць выкарыстоўваць гэты спосаб для адпачынку пасля любых нагрузак».**

Акрамя трэніровак і спаборніцтваў, важная частка параалімпійскага спорту — класіфікацыя. Каб спаборніцтвы былі справядлівымі і роўнымі, дзейнічае сістэма, якая гарантуе, што перамога будзе вызначацца пэўнымі навыкамі, фізічнай падрыхтоўкай, вынослівасцю і тактычнымі здольнасцямі. Мэта класіфікацыі — звесці да мінімуму ўплыў парушэнняў на спартыўную дзейнасць. Адным з самых важных Ягор называе старт у англійскім Шэфілдзе, дзе праходзіў класіфікацыю напярэдадні Параалімпійскіх гульняў. «Гэта быў вельмі важны этап для мяне. Мы ўсе перажывалі за класіфікацыю, бо многія яе не праходзяць. У мяне была пагранічная сітуацыя паміж 9 і 10 класамі. Да гэтага я тры гады быў у 10-м, затым — год у 9-м. Але, калі б цяпер мне далі 10 клас, ехаць у Токіа не было б сэнсу. Вынікі гэтых класаў адрозніваюцца як неба і зямля, і ў мяне не было б ніякіх шанцаў. Многае залежыць і ад таго, як дома будуць падрыхтаваныя дакументы, таму дзякуй спецыялістам, якія імі займаліся», — расказвае Ягор.

«Серабро» Параалімпійскіх гульняў — узнагарода, безумоўна, важная, але не галоўная. Запаветная мэта — «золата». Таму цяпер уся ўвага і ўсе сілы Ягора Шчалканава скіраваныя на Параалімпійскія гульні 2024 года ў Парыжы. І матывацыя ў яго самая простая, але самая шчырая: «Серабро» ў мяне ёсць, хацелася б яшчэ і «золата». Бацькі, дзед, за мяне вельмі перажываюць, і мне хацелася б іх парадаваць».

Чэмпіёны

**Максім НЕДАСЕКАЎ:**

# «Мы скачам з дапамогай не сілы, а галавы»

**Кожныя Алімпійскія гульні — гэта чарговая старонка спартыўнай гісторыі, якую ўвесь свет бачыць на свае вочы. Менавіта гэтым яны і прыцягваюць мільёны людзей. І таму цікавейшымі становяцца непасрэдныя ўдзельнікі новай гісторыі — спартсмены. Сёлета ўсе назіралі, як у Токіа робіцца гісторыя ў скачках у вышыню. Упершыню алімпійскімі чэмпіёнамі сталі адразу два спартсмены. Акрамя таго, чэмпіёнскі вынік і вынік трэцяга месца абсалютна аднолькавыя — 2 метры 37 сантыметраў. І, што асабліва важна, у цэнтры гэтай гісторыі — беларус Максім Недасекаў, ад алімпійскага «золата» яго аддзялілі некалькі няўдалых спроб. Але сам спартсмен лічыць, што «бронза» — толькі пачатак яго алімпійскай гісторыі.**

***— Максім, спаборніцтвы ў скачках на Алімпійскіх гульнях у Токіа былі сенсацыйныя. У мужчын — два алімпійскія чэмпіёны, у жанчын — трыумфальная перамога Марыі Ласцікенэ. Што ты думаеш на гэты конт?***

— Гэта ж добра, што так шмат цікавых падзей і ўвагі! У нас была сапраўдная сенсацыя — упершыню ў гісторыі скачкоў у вышыню два пераможцы. Ніколі не было і такога, што ў першага і трэцяга месца вынік 2 м 37 см. І ў чацвёртага і пятага месцаў аднолькавы вынік — 2,35. Канкрэтна на Алімпійскіх гульнях такога ніколі не было, на чэмпіянатах свету здаралася. Але гэта Алімпіяда, не проста так рэкорд Алімпійскіх гульняў — 2,39. Спартсмены могуць скакаць і вышэй, але на Алімпіядзе на спартсменаў заўсёды вялізны ціск, што адбіваецца і на выніках.

***— Ты кажаш, што ў 23 гады станавіцца чэмпіёнам рана. Джанмарка Тамберы — 29 гадоў, Мутазу Баршыму — 30 гадоў. Атрымліваецца, што пік формы ў скачках у вышыню прыпадае дзесьці на 30 гадоў?***

— Так, ідэальны ўзрост пачынаецца ад 26 гадоў, калі арганізм ужо цалкам сфарміраваны. У прынцыпе ў 23 ён таксама ў добрай форме. Але бліжэй да 25 гадоў ужо можна выконваць большыя аб'ёмы, нагрузкі, у гэтым узросце косці, мышцы, суставы толькі ўмацоўваюцца. І, што важна, мы ж скачам з дапамогай не сілы, а галавы. У кожнага чалавека ёсць свой унутраны рэзерв. Калі ён уключаецца, чалавеку нічога не страшна, ён усё можа, як пры ўсплёску адрэналіну. І мы вучымся такі стан уключаць на спаборніцтвах. І зразумела, што з узростам, з вопытам гэта атрымліваецца лепш. На Алімпійскіх гульнях усе былі добра гатовыя, але перамагалі тыя, хто лепш уключыў у сабе гэты ўнутраны рэзерв. Я дастаў з сябе максімум і лічу, што 2,37 — добры вынік на Алімпійскіх гульнях для майго ўзросту.

**«Я аднойчы выступаў са зламаным пальцам на назе. Прычым зламаў яго вельмі недарэчна, сам быў вінаваты. А выступаць трэба, хоць і балюча. Ну а раз сам вінаваты — мне і пакутаваць».**

***— У такім выпадку ў якім узросце ў скачках у вышыню надыходзіць спад формы?***

— Дональду Томасу — 37 гадоў, і ён бярэ 2,30 на спаборніцтвах. Усё залежыць ад падрыхтоўкі спартсмена. Калі ён рыхтуецца планамерна, не фарсіруе падзеі, то дажыве і да «спорту пасля 30». А калі неразумна падыходзіць да трэніровак, фарсіруе падзеі, то ўсё можа скончыцца траўмай і ў 25. З часам, калі мышцы, суставы ўмацоўваюцца, атрымаць траўму не так і проста. Я на трэніроўках магу не так паставіць нагу, яна крыху падвернецца, але без сур'ёзных наступстваў, бо добра падрыхтаваны мышцы.

***— Многіх цікавіць пытанне: паколькі два «залатыя» чэмпіёны, чаму ў цябе «бронзавы» медаль, а не сярэбраны?***

— Усё проста: «серабро» перайшло ў «золата», а «бронза» засталася на сваёй пазіцыі. Калі б я перайшоў на другое месца, чацвёртае месца павінна было б перайсці на трэцяе. А так быць не можа.

***— Шчыра кажучы, калі б ты апынуўся ў такой сітуацыі, ты б пераскочыў рашаючую спробу, каб раздзяліць «золата» і «серабро»?***

— Гэта залежыць ад таго, з кім бы я апынуўся ў такой сітуацыі. Калі б гэта былі Тамберы ці Баршым, я б выканаў яшчэ адну спробу. Няважна, прайграў бы ці не. Я ў сабе ўпэўнены, і я б скокнуў яшчэ раз. А калі б там быў мой сябар Ілья Іванюк, я б задумаўся, ці варта гэта рабіць. Тамберы і Баршым — добрыя сябры, і яны зрабілі гісторыю. І гэта сапраўды прыгожа — два сябры разам становяцца алімпійскімі чэмпіёнамі. Я б са сваім сябрам паступіў такім жа чынам.

***— У скачках у вышыню ў цябе шмат сяброў?***

— Дастаткова. У мяне добрыя адносіны з Андрэем Чурылам. Пасля Алімпіяды пасябравалі з Джанмарка Тамберы. Усе ведаюць, што мае сябры — расіяне Ілья Іванюк і Міша Акіменка. Мае добрыя таварышы — Багдан Бандарэнка і Андрэй Працэнка з Украіны. Увогуле, у нашым сектары ва ўсіх добрыя адносіны. Да кожнага спартсмена можна падысці, нешта спытаць, аб нечым папрасіць, параіцца, і ніхто не адмовіць. У нас няма такога, каб мы жадалі няўдачы ці правалу адзін аднаму. У скачках у вышыню заўсёды так. Гэта яшчэ спартсмены старэйшага пакалення завялі, а мы працягваем. Разам спаборнічаем — разам і адпачываем. І падчас спаборніцтваў лягчэй, калі паміж спробамі можаш пажартаваць, паразмаўляць на іншыя тэмы. Гэта дапамагае не нервавацца і не хвалявацца.

***— Максім, зыходзячы з усіх эпідэміялагічных мер, было мала часу, каб акліматызавацца ў Токіа. Табе хапіла часу?***

— Я прыляцеў у Японію за два дні да пачатку спаборніцтваў. Якая можа быць акліматызацыя ў маладых спартсменаў? Малады арганізм на змену клімату не рэагуе, ён хутка адаптуецца да розных умоў. З узростам арганізму становіцца цяжэй, і тут ужо можа спатрэбіцца час на акліматызацыю. А калі мне кажуць пра акліматызацыю маладыя спартсмены, я ўсміхаюся. Магчыма, таму што сам на сабе такога не адчуваў. І ўвогуле, надвор'е ніяк не ўплывае на форму і выступленне. Толькі калі сам сабе настроіш, што раз ідзе дождж, значыць, добра выступіць не атрымаецца. У сектары ўсе знаходзяцца ў аднолькавых умовах, і кожны выходзіць туды спаборнічаць.

***— У скачках у вышыню ёсць максімальная мяжа?***

— Хутчэй не, чым так. Цяпер сусветны рэкорд — 2,45 метра, але яго паб'юць. Гэта абсалютна рэальна. Проста для гэтага трэба правільна падрыхтавацца. Два гады прысвяціць выключна трэніроўкам і думаць толькі аб іх.

***— У цябе цудоўна атрымалася скокнуць 2,37, але 2,39 пакуль не паддаліся. Няўжо два сантыметры адыгрываюць такую важную ролю?***

— Не ў сантыметрах справа, два сантыметры — гэта не шмат. Але нават лішнім разам узяць 2,37 складана. Усё залежыць ад таго ўнутранага рэзерву, пра які я казаў раней. З кожнай спробай уключаць яго ўсё складаней. Як было на Алімпіядзе? Калі стала зразумела, што на 2,33 медалі разыгрывацца не будуць, прыйшлося браць 2,35, я яе не ўзяў. І зразумеў, што максімум прыйдзецца паказваць на 2,37 ці 2,39. А ўнутраны рэзерв, адрэналін з кожнай спробай трацiўся. І мне яго хапіла на 2,37. Я спрабаваў скокнуць 2,39, але нас затрымалі з-за бегуноў. Такое часта здараецца, калі ты настройваешся, ужо гатовы бегчы, а табе не даюць. І ўвесь запал згасае. Гэтыя два сантыметры — больш псіхалагічны, чым тэхнічны момант. Мой арганізм гатовы ўжо і 2,40 скокнуць — усё залежыць ад псіхалогіі.

***— Растлумач, калі ласка, як чалавек, які скача 2,37, не бярэ вышыню 2,19?***

— Я проста не ўмею скакаць вышыні ад 2,20 да 2,30. Я іх не разумею. З аднаго боку, і не трэба вельмі старацца, а з іншага — трэба. Я люблю скакаць, калі планка высока і трэба цягнуцца да яе, трэба трымаць гэты скачок да апошняга. А на гэтых вышынях планка нізка, і скачок адразу абрываецца. Для мяне гэта праблема. Калі ў мяне не атрымліваецца нават 2,28, адразу пераношу спробы на 2,30. На гэтай вышыні я адчуваю сябе ўпэўнена.

***— У гэтым прычына тваёй тактыкі — пераносіць спробы на больш вялікія вышыні?***

— Менавіта так. На апошнім старце я размаўляў з бацькам Джанмарка Тамберы. І ён расказаў, што, калі я пераношу спробы, Джанмарка мяне ненавідзіць. Таму што, калі я пераношу, я іх заўсёды бяру. Мяне за гэта не вельмі любяць, а мне падабаецца такая тактыка. Пераносіць вышыню цяжка. Трэба быць псіхалагічна падрыхтаваным, каб узяць планку, вышэйшую за тую, што не атрымалася. Таму мала хто так робіць. Але я ў гэтым плане псіхалагічна ўстойлівы. Ну і не варта забываць пра ўнутраны рэзерв.

***— Ці былі выпадкі, калі цябе гэтая тактыка падводзіла?***

— Здараліся выпадкі, калі я проста быў не падрыхтаваны да пэўнай вышыні. І ў такіх выпадках я гуляю сваёй тактыкай. Разумею, што не атрымаецца, але ўсякае можа быць.

***— Ты вядомы як любімец публікі на трыбунах. Але ў Токіа гледачоў на трыбунах не было...***

— З поўным стадыёнам лёгка выступаць, я не затрачваю столькі сіл, як здаецца. Гледачы аддаюць сваю энергію, я — сваю, і атрымліваецца такі кругаварот энергіі на стадыёне. А на пустым стадыёне скачаш сам з сабой. Але ў Токіа мне было няважна: будуць людзі на трыбунах ці не. Я стараўся, каб мяне нічога не адцягвала. Алімпіяда — самы адказны старт, і трэба быць поўнасцю засяроджаным на самім сабе.

**«У нас няма такога, каб мы жадалі няўдачы ці правалу адзін аднаму. У скачках у вышыню заўсёды так. Гэта яшчэ спартсмены старэйшага пакалення завялі, а мы працягваем».**

***— У 2018 годзе на чэмпіянаце Еўропы ты заваяваў «серабро», выступаючы з язвай. На чэмпіянаце свету напярэдадні твайго выступлення ў гасцініцы быў патоп. Нейкая дзіўная заканамернасць?***

— Як паказвае практыка, калі нешта здараецца, значыць, будуць добрыя спаборніцтвы. А калі ўсё будзе гладка — выступлю дрэнна. На Алімпіядзе на мяне пастаянна капала вада з кандыцыянера. З кожнай сітуацыі можна знайсці выйсце. І на адказных стартах не варта звяртаць увагу на нейкія дробязі. Я аднойчы выступаў са зламаным пальцам на назе. Прычым зламаў яго вельмі недарэчна, сам быў вінаваты. А выступаць трэба, хоць і балюча. Ну а раз сам вінаваты — мне і пакутаваць.

***— Максім, у верасні ў фінале Брыльянтавай лігі ты размясціўся на чацвёртай пазіцыі. Адбілася стомленасць пасля Алімпійскіх гульняў?***

— Брыльянтавая ліга не самы важны старт. Ён не дае ніякіх прывілей. Важна добра выступаць на чэмпіянатах Еўропы, свету, на Алімпійскіх гульнях. Гэта добры камерцыйны, але не самы важны старт, таму пасля Алімпійскіх гульняў усе выступалі ў сваё задавальненне. Поўнасцю выкладыся ў Токіа. Амаль ніхто за вынікам не гнаўся. Ну, хіба што тыя, хто на Алімпіядзе сябе не праявіў. Я сваім вынікам задаволены. Я зрабіў усё, што было ў маіх сілах, на Алімпійскіх гульнях. Цалкам аддаў энергію і маральны стан туды. І вярнуць такі эмацыянальны стан яшчэ на тры старты пасля Алімпіяды было немагчыма. І ўжо не патрэбна. Я проста добра правёў час на гэтых турнірах.

***— Калі Алімпіяда ўжо прайшла, і для цябе — вельмі паспяхова, можаш ацаніць, ці карысным быў дадатковы год?***

— Цяжка сказаць. І я ў мінулым годзе быў гатовы на такі вынік. Проста за гэты год выпала няшмат стартаў і не было сэнсу выніку паказваць. Увогуле, з маіх калег у форме ніхто не страціў, усе былі добра гатовыя. Праўда, на Алімпіядзе мы ўпершыню ўбачылі карэйца. Дагэтуль ні на якіх турнірах яго не бачылі, а на Алімпіядзе ён адразу заняў чацвёртае месца. Гэта вельмі загадкава. І, магчыма, для такіх спартсменаў дадатковы год пайшоў на карысць.

***— Максім, дай ацэнку ўсяму летняму сезону?***

— Я магу ацаніць увесь гэты год. Тры скачкі па 2,37 кажуць пра многае. Я ніколі не думаў, што вазьму такую вышыню. Думаў, буду скакаць 2,30 і гэта будзе мой максімум. Затым узяў 2,25 і тады зразумеў, што магу яшчэ вышэй, гэта рэальна. Наступная вышыня — 2,39–2,40. Я да гэтага гатовы, проста патрэбна падысці да такіх вышынь.

***— Матывацыя пасля алімпійскага медаля змянілася?***

— Не, абсалютна. Я нават не магу сказаць, што ў маім жыцці нешта кардынальна змянілася. Я забраў сваё, на што разлічваў. Але мая галоўная мэта — алімпійскае «золата» — яшчэ не дасягнутая. Засталося тры гады, і трэба рыхтавацца і трэніравацца. Усё як звычайна.



**Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «БААЗ», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 |
| Адрес ЭТП | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: ТРАНСПОРТНЫЕ СРЕДСТВА, СПЕЦТЕХНИКА БЫВШИЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ**
**Местонахождения:**
**Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62**

| № лота | Наименование | Год выпуска | Инв. № | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2 | **Автомобиль SKODA SUPERB, рег. знак 1IPT 0562** | 2010 | 7805 | **12 528,00** |
| 3 | **Прицеп MAZ 837810, рег. знак АА 5501-1** | 2009 | 7803 | **9 000,00** |
| 4 | **Микроавтобус MAZ-182010, рег. знак 1ICT 1517** | 2012 | 7819 | **14 280,00** |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 10 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 19.08.2021 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.10.2021 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

